ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 128 (27986) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Сакрэт Ларысы Грыбалёвай

Студэнцкае шчасце — дах над галавой

Што паказала ЦТ-2015?

СТАР. 3

ЛІЧБА ДНЯ

81,9 кг

золата ў злітках прадаў за першае паўгоддзе Нацыянальны банк краіны, выкупіў назад — каля 47,2 кг. За шэсць месяцаў Нацбанк рэалізаваў 8 тысяч 460 залатых зліткаў. Найбольшым попытам у беларусаў карысталіся 1-, 5- і 10-грамовыя. Назад выкуплена 1 тысяча 865 залатых зліткаў. Серабра за студзень—чэрвень прададзена больш за 42,7 кг (1080 зліткаў), выкуплена назад каля 22,4 кг (144 зліткі). Плаціны беларусы купілі 295 г, а прадалі Нацбанку — 659 г. У зліткаў гэта 55 і 42 штукі адпаведна.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.07.2015 г.

Долар ЗША	15446,00	▲
Еўра	17046,00	▲
Рас. руб.	270,12	▲
Укр. грыўня	705,30	▼

ISSN 1990 - 763X

З ПОЎНЫМІ!

У многіх нашых вёсках дагэтуль такая завядзёнка: калі статак пасвіцца ад дому блізка, даіць кароў удзень проста ў полі. Наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук сустрэў гаспадынь з вёскі Пялікі Шаркаўшчынскага раёна, калі яны вярталіся ад сваіх рагуль з поўнымі даёнкамі.

Першыя акорды «Славянкі»

Урачыстае адкрыццё XXIV міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» адбудзецца сёння вечарам. На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы — у Летнім амфітэатры — роўна ў 20.30 прагучаць першыя акорды «базару». Сярод беларускіх і расійскіх «зорак» Валерый Лявонцьеў, Ірына Алеграва, Тамара Гвердцытэлі, Леў Лешчанка, Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, Анжэліка Агурбаш, Алена Ланская. Выступяць артысты і калектывы з краін далёкага замежжа: з Вялікабрытаніі, Швецыі, Румыніі...

СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

■ Птушыная праблема

ГАЛОДНАЕ ЛЕТА БУСЛОЎ

Колькасць птушанят на гняздоўях сёлета скарацілася ў разы



Увогуле, спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак бацькаўшчыны» (АПБ) называюць лета 2015-га адным з самых няўдалых для нашых буслоў. Назіранні паказалі, што сёлета больш за палову гняздуючых пар маюць у вывадку толькі па аднаму-двое птушанят.

Сёння эксперты АПБ паведамляюць аб папярэдніх выніках акцыі па ўліку і кальцаванні белых буслоў. Яшчэ да выезду спецыялісты казалі пра тое, што год вельмі няпросты: працэнт няўдалага гнездавання пар як ніколі высокі, а ў гнёздах тых, хто ўсё-такі змог абзавесціся «малымі», мала птушанят. Тлумачыцца гэта многімі фактарамі: спачатку была сухая вясна, потым раптоўныя халады ў яе сярэдзіне, летнія засухі, перасыханне вадаёмаў. Пракарміцца самім ды яшчэ і выгадаваць птушанят складана не толькі буслам, але і ўвогуле ўсім птушкам.

Арнітолагі НАН Беларусі пры падтрымцы АПБ працуюць ужо другі тыдзень і могуць падзяліцца сваімі ўражаннямі.

СТАР. 3

НАША КРАІНА НАБЫВАЕ СТАТУС НАЗІРАЛЬНІКА Ў ШАНХАЙСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам ва Уфу для ўдзелу ў мерапрыемствах, звязаных з правядзеннем сустрэч на вышэйшым узроўні міждзяржаўнага аб'яднання БРІКС і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

Акрамя ўдзелу ў сустрэчы кіраўнікоў краін, якія ўваходзяць у БРІКС, з лідарамі запрошаных дзяржаў для абмеркавання найбольш актуальных пытанняў сусветнай палітыкі, эканомікі, фінансавай сферы, у рабочым графіку Прэзідэнта значыцца і шэраг двухбаковых сустрэч.

У прыватнасці, учора Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным, паведамляе БЕЛТА. Прэзідэнт Расіі падчас сустрэчы паведаміў, што Беларусь набывае статус назіральніка ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Гэтае пытанне можна лічыць вырашаным», — сказаў кіраўнік расійскай дзяржавы. «Мы ўпэўненыя ў тым, што ваш удзел у рабоце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва пойдзе на карысць як Беларусі, так і ўсім удзельнікам арганізацыі», — адзначыў расійскі лідар.

У сваю чаргу, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь абсалютна падтрымлівае дзеянні БРІКС і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва на сусветнай арэне. Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што «нарэшце знайшліся арганізацыі, якія рызыкнулі вызначыць некалькі іншыя кірункі дзеянняў на сусветнай арэне». «Гэта намі абсалютна падтрымліваецца, прымаецца. Гэта будзе толькі на карысць усім людзям, якія жывуць на зямлі. І тыя імпульсы ў фінансавым, эканамічным дачыненні, якія вамі зроблены ў апошні час у рамках Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, БРІКС, — гэта вельмі добрыя кірункі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну за падтрымку беларускага боку.

ЛІДАРЫ ЕЎРАПЕЙСКІХ ДЗЯРЖАЎ АДЗНАЧАЮЦЬ РОЛЮ БЕЛАРУСІ Ў АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРАМОЎ ПА УКРАІНЕ

Аб гэтым сведчаць віншавальныя пасланні з нагоды Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, якія працягваюць паступаць у адрас Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У прыватнасці, Прэзідэнт Германіі Іахім Гаўк у сувязі з гэтым падкрэсліў, што гатоўнасць Беларусі падтрымліваць сумесныя еўрапейскія намаганні па захаванні бяспекі і міру на кантыненце заслугоўвае прызнання.

Віншавальныя пасланні ў адрас беларускага лідара працягваюць паступаць ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, замежных палітычных, грамадскіх дзеячаў. З нацыянальным святам Аляксандра Лукашэнку і беларускі народ у тым ліку павіншавалі прэзідэнты Алжыра, Грэцыі, Італіі, Лаоса, Кот-д'Івуара, Румыніі, Сірыі, Турцыі, Францыі, Эквадора, каралі Іарданіі, Марока, Саудаўскай Аравіі, Тайланда, а таксама султан Амана, эмір Катара.

■ Стыхія

ПАЖАР ПРАРЫВАЕЦЦА ПРАЗ МЯЖУ

Каля 200 чалавек змагаюцца з агнём

— Моцны вецер гоніць полымя з Украіны на Гомельшчыну, — паведаміў **намеснік старшыні Лельчыцкага райвыканкама Дзмітрый ШПІГАНОВІЧ**, які на момант сувязі знаходзіўся ў сітуацыйным штабе ліквідацыі надзвычайнага здарэння.

Ля вёсак Кавыжаў і Лохніца, што зусім побач з дзяржаўнай мяжой, увесь дзень 8 ліпеня ішло актыўнае тушэнне пажару. Дарэчы, полымя перакідваецца як па верхавінах дрэў, так і сцелецца па зямлі. Адна з крыніц узгарання знаходзіцца ў багністай мясцовасці. Менавіта таму для тушэння задзейнічана ўся магчымая тэхніка. На зямлі — сельскагаспадарчая, лесагаспадарчая і спецыялізаваная. З неба пажар тушаць верталёты Мі-26 і Мі-8. Каля 200 чалавек выйшлі на барацьбу з агнём. Пакуль ніхто не дае прагнозаў наконт таго, калі пажар будзе затушаны, бо вецер не сціхае, а яго напрамак пастаянна мяняецца. Выратавальнікі лічаць, што максімальная плошча, ахопленая полымем, складае каля 120 га. Тым не менш, панікі сярод людзей няма, усе службы працуюць зладжана.

У раёне памежнага пераходу «Глушкавічы» агонь, які ішоў з тэрыторыі Украіны, быў спынены непасрэдна на мяжы з Беларуссю з дапамогай абворвання. Арганізавана пастаяннае дзяжурства. Леснікі, вайскоўцы Мазырскай памежнай групы, выратавальнікі-пажарныя адсочваюць сітуацыю.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *astashkevich@zviazda.by*

■

БПС-СБЕРБАНК

С 09.07.2015 ОАО «БПС-Сбербанк» снижает размер процентов по заключенным с 22.01.2015 по 26.03.2015 (включительно) договорам в долларах США и евро срочного банковского депозита «Доверяй+» на 0,5 п.п. – до 6% (годовых).

Установленный размер процентов будет применен с 09.08.2015.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по единому короткому номеру 148.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

■ Жыллё маё

ЗАПЛАНАВАЛІ ТОЛЬКІ РЭАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ

Днямі ўрад краіны скарэкціраваў праграму жыллёвага будаўніцтва на 2015 год

Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 30 чэрвеня №538. Згодна з дакументам, збіраюцца ўвесці ў эксплуатацыю 4 млн кв. м жылля. У тым ліку для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, сёлета плануецца пабудаваць 3 млн 485,9 тысячы кв. м, з якіх 2 млн 864,6 тысячы кв. м — для тых, хто ажыццяўляе будаўніцтва з дзяржпадтрымкай. Атрымліваецца, што ўдакладненая праграма па краіне губляе адразу мільён «квадратаў» запланаванага жылля.

ШМАДЗЕТНЫМ ДАБАВІЛІ

Саўмін перагледзеў гадавы аб'ём будаўніцтва жылых дамоў (кватэр) для шматдзетных сем'яў, які зараз павялічыўся і склаў 364,1 тысячы. кв. м. Раней для гэтай катэгорыі ў краіне хацелі пабудаваць жыллё для 4130 шматдзетных сем'яў, цяпер — для 4400. Крыху павялічылі планы па ўзвядзенні жылля сацыяльнага карыстання і жылля, пабудаванага для адсялення грамадзян з аварыйных дамоў.

КАМЕРЦЫЙНАЕ — ПАДРЭЗАЛІ

Арэнднага жылля мяркуецца пабудаваць у краіне 185,7 тысячы кв. м, што значна менш за папярэднія планы, па якіх толькі ў Мінску разлічвалі ўзвесці каля 147,6 тысячы кв. м. Найбольшы аб'ём у памеры 43,4 тысячы кв. м. камерцыйнага жылля будзе пабудаваны ў Гродзенскай вобласці з улікам жылых дамоў для работнікаў, якія выконваюць комплекс работ па будаўніцтве ў Астраўцы атамнай электрастанцыі. А вось у Мінску плануецца ўзвесці толькі 33,6 тысячы кв.м. жылля для камерцыйнага выкарыстання.

СПАДАРОЖНІКІ ПАЧАКАЮЦЬ

Знізілі аб'ём будаўніцтва жылых дамоў (кватэр) і ў гарадах-спадарожніках, які запланаваны на ўзроўні 7,5 тысячы кв. м жылля. Асобныя праекты па гэтым напрамку ўвогуле замарозілі. У прыватнасці, у Смалявічах сёлета будаваць нічога не будуць, а да гэтага планавалі здаць кватэры для 230 сем'яў.

ПЛАНЫ КАРЭКТУЮЦЦА ФІНАНСАВАННЕМ

Распрацоўшчыкі пастановы Саўміна падрыхтавалі папярэдні прагноз і на 2016 год. Налета ў Беларусі плануецца ўвесці ў эксплуатацыю таксама 4 млн кв. м жылля, у тым ліку каля 1 млн 580 тысяч для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў і якія ажыццяўляюць будаўніцтва з дзяржаўнай падтрымкай.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Нагадаю, што яшчэ вясной **міністр Мінбудархітэктуры Аляксандр КРУЧАНАЎ** ацэньваў заданне на 5 млн жыллёвых «квадратаў» па краіне як нерэальнае. На яго погляд, у галіны цяпер недастаткова сродкаў на ажыццяўленне такога аб'ёму будаўніцтва, у тым ліку на фінансаванне будаўніцтва 2,5 млн кв. м жылля з дзяржпадтрымкай.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

■ Сітуацыя

МІНГАНДЛЮ БОЛЬШ НЕ ПАПЯРЭДЖВАЕ

Рэстаран «Журавінка» закрылі за пратэрміноўку, а сетку магазінаў «Дабраном» — за даўгі

У міністэрстве паведамляюць, што падчас пазапланавай праверкі парушэнні патрабаванняў заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў выяўлены ў рэстаране «Журавінка», рэстаране хуткага абслугоўвання «Food Republic» і кафэ «River Cafe» (таварыства «Шахін») сталіцы.

НЕДАВАЖКА — ДА 40%

Усяго кантралёрамі знята з рэалізацыі пратэрмінаваная прадукцыя на суму каля 14 млн рублёў. Устаноўлены факты невыканання асартыментных пералікаў, тэмпературных рэжымаў захоўвання прадукцыі, парушэння кантролю якасці і бяспекі выпускаемай прадукцыі, захоўвання прадукцыі без дакументаў, якія пацвярджаюць факт яе набыцця, якасць і бяспеку. Былі парушэнні пры рэалізацыі алкагольных напояў без акцызных марак і з пашкоджанымі акцызнымі маркамі і г.д.

Прэс-служба ведамства паведамляе, што таксама выяўлены выпадкі падману пакупнікоў: пры выбарачным узважванні асобных гатовых страў недаважка ў іх склала да 40% ад намінальнай масы, якая вызначана ў тэхналагічных дакументах. Для ліквідацыі выяўленых парушэнняў і забеспячэння сапраўднага кантролю за якасцю і бяспекай прадукцыі, што там рэалізуецца, дзейнасць гэтых аб'ектаў прыпынена з 8 ліпеня.

177 МАГАЗІНАЎ — У «АДПАЧЫНАК» НА 90 ДЗЁН

Крыху пазней Міністэрства гандлю прыняло рашэнне і аб прыпыненні на 90 дзён (з 21 ліпеня) дзейнасць 177 магазінаў закрытага акцыянернага таварыства «Дабраном».

Пачынаючы з лютага бягучага года, пытанне своечасовасці разлікаў гандлёвых сетак з пастаўшчыкамі за пастаўленую прадукцыю неаднаразова абмяркоўвалася на пасяджэннях калегіі Мінгандлю. Сеткавым арганізацыям прапаноўвалася прыняць вычарпальныя меры па пагашэнні пратэрмінаванай запазычанасці», — гаворыцца ў паведамленні ведамства. Разам з тым, на момант праверкі фірмы «Дабраном» пратэрмінаваная запазычанасць арганізацыі за пастаўленыя тавары, у тым ліку мяса, малако і хлеб, склала звыш 30 млрд рублёў. Зараз у гаспадароў гандлёвай сеткі ёсць 90 дзён, каб разлічыцца па даўгах.

Сяргей ПАЛІНІН

■

■ Грошы

ПРАДАЛІ $3,5 млрд ЗА ПАЎГОДА

Беларусы працягваюць заставацца чыстымі прадаўцамі валюты, хоць і павялічылі ў апошні месяц куплю замежных наяўных грошай.

Па звестках Нацбанка, у чэрвені грамадзяне купілі на 29,3% больш валюты ў параўнанні з маем — 508,3 млн долараў. Сёлета столькі яшчэ не куплялі. Пры гэтым продаж вырас на 2,4% — 615,2 млн долараў. З улікам безнаяўнага продажу валюты насельніцтва таксама застаецца чыстым прадаўцом. Агулам жа ў студзені—чэрвені грамадзяне прадалі 3,657 млрд долараў, купілі — 2,968 млрд.

Сальда куплі-продажу валюты беларускімі суб'ектамі гаспадарання за шэсць месяцаў таксама адмоўнае. Рэзідэнты купілі 9,016 млрд долараў, прадалі — 9,078 млрд.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ. *kuletski@zviazda.by*

■

■ Не для пераймання

ВАЛЮТЧЫК ПА ВЫКЛІКУ

Прыватны абменнік у Полацку «пацягнуў» на крымінальную справу

Новая дзейнасць беспрацоўнага грамадзяніна М. у горадзе Полацку пачалася яшчэ ў снежні 2013-га, калі ён арганізаваў для іншых фізічных асоб незаконныя аперацыі па абмене замежнай валюты на беларускія рублі і наадварот. Паводле інфармацыі намесніка начальніка Навапалацкага міжраённага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці Дзмітрыя ДЗЯГІЛЕВА, спрытны прадпрымальнік кожную раніцу прыходзіў у кавярню, размешчаную ў раёне гарадскога калгаснага рынку, як на працу.

Там ён піў каву і чакаў кліентаў, якія заходзілі асабіста для абмену валюты альбо тэлефанавалі яму і дамаўляліся пра сустрэчу побач з кавярняй. Калі неабходна было абмяняць буйную суму грашовых сродкаў, валютчык гатовы быў выехаць на тэрыторыю кліента. Звычайна валюту ў яго набывалі прадпрымальнікі з калгаснага рынку, а прадавалі яе як звычайныя грамадзяне, так і прадпрымальнікі, якія прывозілі выручку ў замежнай валюце пераважна з Расіі. У выніку куплі-продажу грашовых знакаў полацкі валютчык атрымаў даход на суму звыш 224,3 млн рублёў, што на момант здзяйснення злачынства перавысіла 1,2 тысячы базавых велічынь. А гэта ўжо з'яўляецца буйным памерам.

Пры гэтым мясцовы жыхар ажыццяўляў прадпрымальніцкую дзейнасць без дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы, якая ажыццяўляе банкаўскую дзейнасць, і спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на валютна-абменныя аперацыі.

Менавіта таму Навапалацкім міжрайаддзелам фінансавых расследаванняў і была заведзена крымінальная справа па лініі «фінансава-крэдытная сістэма» ў дачыненні да 46-гадовага «шэрага» прадпрымальніка. Варта адзначыць, што ўся сума незаконнага даходу была ў поўным аб'ёме выплачана парушальнікам у бюджэт.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

Першыя акорды «Славянкі»

ПЕРАЖЫВАЕМ ЗА НАШЫХ!

Удзельнік канцэрта Палад Бюль-бюль-аглы сёлета — старшыня журы фестывальнага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні. Яго імянная зорка з'явілася ля амфітэатра на Алеі зорак. Ля апошняй удзень адбылося лёсаванне ўдзельнікаў конкурсу.

Нашу краіну прадставіць 20-гадовая Валерыя Грыбусава — прывабная дзяўчына родам з Магілёва. Яна вакалістка Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. У скарбонцы яе творчых дасягненняў гран-пры нацыянальных і міжнародных фестываляў-конкурсаў. У прыватнасці, французскага «Пад небам Парыжа». Пажадаем ёй заваяваць «золата» і на «базары».

А лёсаванне дзіцячага конкурсу адбудзецца ў пятніцу. Нашы канкурсанткі — 9-гадовая мінчанка Стэфанія Сакалова і 11-гадовая Алена Цітова з Магілёва, якая выступае пад творчым псеўданімам Элеці.

Таксама заўтра адкрыецца фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах»... Прыемным сюрпрызам стане творчы вечар кампазітара Аляксандры Пахмутавай і паэта Мікалая Дабранравава «Нам не жыць адно без аднаго».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ВАСІЛЬКІ ШАГАЛА

Адзін з «зорных» удзельнікаў фэсту Сяргей Бязрукаў прызнаўся журналістам, што ён марыў зноў прыехаць у Віцебск, каб убачыць шагалаўскія мясціны. 7 ліпеня наведаў дом-музей Шагала і Арт-цэнтр, дзе прадстаўлены графічныя работы. У гэты дзень можна сказаць, па-камернаму, без асаблівай помпы ў фестывальным горадзе адсвяткавалі 128-ю гадавіну з дня нараджэння майстра. Дарэчы, яму вельмі падабалася магічная камбінацыя лічбаў даты нараджэння: 7.07.1887...

Спачатку прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, прыхільнікі творчасці мастака ўсклалі кветкі да яго помніка. А ў дварэ дома адбылася музычна-мастацкая вечарына. Артысты самадзейных калектываў спявалі, танцавалі, разыгрывалі сцэнкі з яўрэйскага жыцця часоў Шагала.

Вядома, што дом, які цудам захаваўся да нашых дзён, часта здымаюць дакументалісты. А мінулай вясной выйшаў у пракат мастацкі кінафільм «Шагал — Малевіч» рэжысёра Аляксандра Міты. Карціна распавядае пра віцебскі перыяд жыцця мастака.

У планах гарадской улады — стварэнне «шагалаўскага квартала» побач з музеем: з сувенірнымі крамамі, кавярнямі, гасцініцай.

Можна канстатаваць, што менавіта Шагал натхніў ініцыятараў правядзення «базару» на стварэнне сімвала фэсту. Васілёк — любімая кветка майстра. Вядомы паэт Андрэй Вазнясенскі нават верш свой так і назваў: «Васількі Шагала»...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Ля помніка мастаку.

■ Добрая навіна

АМБУЛАТОРЫЯ З ГІСТОРЫЯЙ

У Клімавіцкім раёне адзначылі 110-ы юбілей Бацэвіцкай амбулаторыі ўрача агульнай практыкі.

Яе заснавальнікам быў вядомы ў медыцыне чалавек — Уладзімір Марзон (у гонар яго ў Бабруйску названа бальніца), які ў 1911 годзе, пасля заканчэння Юр'еўскага ўніверсітэта, прыехаў сюды працаваць у якасці земскага лекара. Менавіта дзякуючы яго клопатам мясцовы памешчык Незабытоўскі паскорыў будаўніцтва неабходных для лячэння карпусоў. Доктар быў усеагульным улюбёнцам, якога насельніцтва цаніла і паважала за адданасць працы і нястомны клопат пра сваіх пацыентаў. Будынак, дзе знаходзіцца амбулаторыя, быў моцна пашкоджаны падчас Вялікай Айчыннай вайны, але адноўлены і цяпер лічыцца помнікам архітэктуры.

Сярод медыцынскіх установ раёна Бацэвіцкая прызнана найлепшай па выніках працы за мінулы год. У зону яе абслугоўвання ўваходзіць 12 населеных пунктаў, дзе жыве каля 2 тысяч чалавек. Прыём вядзе ўрач агульнай практыкі і чатыры сярэднія медработнікі. Летась праз іх рукі прайшло амаль 3000 чалавек, прычым 5-я частка з іх — дзеці.

— Наогул у раёне шмат што робіцца для паляпшэння ўмоў абслугоўвання насельніцтва, — адзначыла **намеснік галоўнага ўрача Клічаўскай раённай бальніцы Дзіяна ЛУК'ЯНАВА.** — Летась нарэшце справіла навасэлле раённая паліклініка, якая 5 гадоў тулілася ў розных памяшканнях. Сёння гэта сучасная ўстанова, якая мае на ўзбраенні добрае медыцынскае абсталяванне. А хутка адкрыецца пасля капрамонту з мадэрнізацыяй Доўгаўская ўрачэбная амбулаторыя, у адным будынку з якой будзе знаходзіцца і бальніца сястрынскага догляду на 20 ложкаў. Прыемна і тое, што сярод нашых медыцынскіх работнікаў ёсць цалкам адданыя сваёй прафесіі людзі, сапраўдныя паслядоўнікі Уладзіміра Марзона. У той жа Бацэвіцкай амбулаторыі 30 гадоў прапрацавала фельчарам Данута Харламп, якая стала для сваіх пацыентаў анёлам-ахоўнікам.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2015

ПАДРЫХТАВАЛІСЯ НА 100 БАЛАЎ!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У Міністэрстве адукацыі разглядаюць магчымасць здачы абітурыентамі на цэнтралізаваным тэсціраванні чатырох дысцыплін, каб пашырыць для маладых людзей магчымасці для выбару прафесіі. Аб гэтым расказаў журналістам міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў. «Але ўсе новаўвядзенні будуць добра прадуманы, а «правілы гульні» стануць вядомыя абітурыентам загадзя», — паабяцаў ён.

Міхаіл Жураўкоў падвёў папярэднія вынікі цэнтралізаванага тэставання. Сёлета 11 абітурыентаў набралі 100 балаў па двух прадметах з трох. Пры гэтым па трэцім прадмеце ЦТ у іх таксама вельмі высокія вынікі — 95, 96, 98 балаў. Напрыклад, Вольга Голуб набрала 100 балаў на ЦТ па рускай мове і грамадазнаўстве, Настасся Захаранка — па беларускай мове і хіміі, Уладзіслаў Меліхаў і Павел Меркіс — па фізіцы і матэматыцы.

«У гэтым годзе мы адышлі ад практыкі падлічваць сярэдні бал па прадмеце, бо ён, у прынцыпе, ні пра што не кажа. Усе ўдзельнікі ЦТ былі падзелены на катэгорыі: на тых, хто скончыў школы, ліцэі, гімназіі, сярэднія спецыяльныя ўстановы і прафтэхустановы сёлета і тых, хто завяршыў навучанне ў папярэднія гады. Па гэтых катэгорыях і падлічваўся сярэдні бал», — патлумачыў міністр.

Аналіз вынікаў ЦТ паказаў, што па рускай і беларускай мовах абітурыенты дастаткова пісьменныя. Сярэдні бал па рускай і беларускай мовах у выпускнікоў ліцэяў і гімназій гэтага года склаў больш за 60 балаў, а ў выпускнікоў агульнаадукацыйных школ — больш за 40. Па матэматыцы сярэдні бал у выпускнікоў ліцэяў — 51, у выпускнікоў школ — 27 балаў. Па словах Міхаіла Жураўкова, самым складаным прадметам для абітурыентаў, як і ў ранейшыя гады, застаецца фізіка. Праўда, сярэдні бал ліцэістаў па гэтым прадмеце — 52 балы, у гімназістаў — 45, а ў выпускнікоў школ — 26. Такім чынам, відаць, што прафілізацыя, якая ёсць у ліцэях і гімназіях, дае свой плён. Тыя ліцэісты і выпускнікі гімназій, якія надавалі фізіцы больш увагі, — здаюць яе на ЦТ лепш, чым выпускнікі звычайных класаў. А выпускнікі прафтэхустаноў здаюць фізіку горш, чым учарашнія школьнікі, бо ў сістэме прафесійнай адукацыі больш увагі надаецца прафесійным, а не агульнаадукацыйным дысцыплінам.

Вельмі нядрэнны вынік на ЦТ паказалі выпускнікі пры здачы замежных моў. Напрыклад, па англійскай мове сярэдні бал выпускнікоў гімназій — 59,8, а ў выпускнікоў школ — 39.

«Увогуле, калі падводзіць папярэднія вынікі, то сістэма цэнтралізаванага тэсціравання зноў даказала сваю жыццяздольнасць і эфектыўнасць, — падкрэсліў міністр. — Мы будзем і далей яе ўдасканальваць, але гэта не будзе паспешлівым працэсам. ЦТ будзе мадэрнізавацца з улікам прафілізацыі навучання ў старшай школе. Плануем увесці яшчэ адну частку — «С», якая будзе адрозніваца ў залежнасці ад патрабаванняў да абітурыентаў канкрэтнай вышэйшай навучальнай установы. Напрыклад, калі ўзяць фізічны факультэт БДУ і любы тэхнічны факультэт, то, вядома, патрабаванні да абітурыента па веданні фізікі ў першых і другіх будуць розныя».

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Сярэдні бал удзельнікаў ЦТ 2015 года

Вучэбны прадмет	Установы агульнай сярэдняй адукацыі			Установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі	Установы прафтэхадукацыі
	Школа	Гімназія	Ліцэй		
Руская мова	40,53	60,57	61,94	25,20	17,63
Беларуская мова	40,00	60,46	60,78	26,23	19,43
Фізіка	25,86	44,59	52,15	15,92	13,41
Матэматыка	27,19	46,25	51,32	15,37	12,76
Хімія	34,13	49,61	53,81	21,02	19,37
Біялогія	33,88	52,85	59,27	27,43	22,79
Англійская мова	38,82	59,76	57,73	26,52	22,86
Нямецкая мова	41,16	60,57	58,00	27,28	23,38
Іспанская мова	43,31	69,52	57,00	27,70	35,60
Французская мова	34,54	56,55	52,30	21,29	19,92
Гісторыя Беларусі	37,46	49,27	52,05	28,35	26,45
Грамадазнаўства	44,54	59,89	63,85	35,89	30,14
Геаграфія	33,05	42,63	49,85	21,87	19,71
Сусветная гісторыя	44,30	54,55	62,75	28,11	29,83
Кітайская мова	-	79,00	-	-	-

* - прадстаўленыя лічбы могуць быць нязначна адкарэктаваныя

Пра класікаў — па-новаму

У Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Я. Карскага адбылася сустрэча з гродзенскай паэткай, літаратуразнаўцай, крытыкам Алай Петрушкевіч, аўтаркай кнігі «Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай», якая нядаўна пабачыла свет. На прэзентацыю былі запрошаны работнікі бібліятэк вобласці, якія прыехалі на курсы павышэння кваліфікацыі. Думаю, яны не пашкадавалі аб вечарыне-канцэрце, якую падрыхтавала пісьменніца разам са студэнтамі ГрДУ імя Янкі Купалы.

У кнізе сем раздзелаў — «Дарогамі філаматаў», «Эліза Ажэшка, Алаіза Пашкевіч, Зоська Верас», «Нашаніўскія класікі ў культурнай прасторы Гарадзеншчыны», «У Заходняй Беларусі», «Іх лёс звязаны з Гараденшчынай», «Ларыса Геніюш, Данута Бічэль, Вольга Іпатава», «Ужо ў XXI стагоддзі». Аўтарка верная сваім перавагам — даследуе творчасць Э.Ажэшкі. А.Пашкевіч, Л.Сівіцкай, Л.Геніюш. А.Карпюка, В.Быкава, Я.Брыля, У.Калесніка і многіх іншых пісьменнікаў, лёс якіх неяк быў звязаны з Гродзеншчынай.

Агульнасць інтарэсаў і паразуменне яскрава прадэманстравалі таленавітыя студэнты факультэта філалогіі — Анжаліка Дудко, Вікторыя Янчарская, сястра і брат Альжбета і Дзмітрый Даўгаполікі і іншыя ўдзельнікі імпрэзы. Мы пачулі ў іх выкананні беларускія вершы, яны спявалі лірычныя рамансы, песні на вершы Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Ларысы Геніюш, Дануты Бічэль.

Дакладна і прафесійна Ала Мікалаеўна расставіла ўсе акцэнты, правяла нешта накшталт экскурсіі па старонках сваёй кнігі. Трэба валодаць глыбінёй ведаў, талентам асобы і творчай інтуіцыяй, каб, здавалася, пра даўно вядомых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў расказаць зусім па-новаму, раскрыць раней не апублікаваныя моманты іх творчых біяграфій, тым самым зрабіўшы гэта здабыткам літаратурнай грамадскасці.

Гэта сапраўдныя маленькія адкрыцці, якія папоўняць скарбонку айчыннага літаратуразнаўства.

Ірына ШАТЫРОНАК.

ГАЛОДНАЕ ЛЕТА БУСЛОЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Загадчыца лабараторыі арніталогіі НПЦ па біярэсурсах НАН Ірына САМУСЕНКА расказвае, што пойма Прыпяці заўсёды была спрыяльным месцам для буслоў, дзе шчыльнасць гнездавання гэтых птушак была самай высокай у краіне. Аднак спадарыня Самусенка адзначае, што сёлета і тут пахваліцца няма чым. Кальцаванне і ўлікі яшчэ не скончаны, але гэты сезон ужо называюць катастрофай: нічога падобнага на Прыпяці за апошнія 20 гадоў не назіралася.

У такіх сітуацыях яшчэ важней становіцца кальцаванне птушак: менавіта гэтыя звесткі дазваляюць атрымліваць інфармацыю пра іх: змену колькасці, паводзін і міграцыйных стратэгій. Вяртанне кольцаў дае навукоўцам карысную інфармацыю і дазваляе звяртаць увагу на праблемы птушак на прафесійным узроўні. Даследаванні паказваюць, што колькасць белых буслоў у нас павялічвалася, але ў апошнія гады сітуацыя пачала сур'ёзна змяняцца.

Кальцавальнікі знаходзяць у гнёздах нямала загінулых буслоў. Мясцовыя жыхары расказваюць, як буслы выкідалі з гнёздаў яйкі і птушанят, а пакідалі толькі па 1-2. Такім чынам птушкі спрабуюць захаваць хоць бы частку нашчадкаў, калі разумеюць, што не змогуць выкарміць усіх. Людзі імкнуліся дапамагчы, падбіралі птушанят і спрабавалі іх выходжваць.

У гэтым выпадку прафесійных арнітолагаў радуе стаўленне нашых людзей да птушак. Відаць, што для многіх яны сталі амаль сваякамі. «Людзі перажываюць з нагоды кожнага загінулага птушаняці і гатовы гадзінамі расказваць пра сямейнае жыццё сваіх птушак. На некаторых дахах шыфер выкладзены толькі да гнязда, каб не разбураць яго. Гэта дае надзею, што белых буслоў у Беларусі ўсё-такі чакае шчаслівая будучыня», — піша ў сваім дзённіку валанцёр АПБ Андрэй Барадзін, які некалькі дзён правёў на ўліках буслоў.

Падлік птушанят белага бусла праводзіцца ў Беларусі ўжо трэці год. За гэты час было «пазначана» больш за 400 птушанят. Сёлета кальцаванне белых буслоў будзе весціся да сярэдзіны ліпеня. Хочацца верыць, што 300 нарыхтаваных кольцаў атрымаюць сваіх гаспадароў. Пакуль на птушанятах гэтага года толькі 185 кольцаў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Утерянные представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 1239712, 1239728 **считать недействительными.** УНП 100122726

■ Разважанні пра сучаснасць

ПРАЗ ЦЯЖКАСЦІ — ДА ПРАГРЭСУ

Упэўненасць у заўтрашнім дні дае калектыву ў паўтары сотні чалавек
невялікая вясковая птушкафабрыка

Дырэктар Аранчыцкай птушкафабрыкі Тэрэса ДЫБУЛЬ толькі што вярнулася з Санкт-Пецярбурга з чарговай узнагародай за якасць сваёй прадукцыі. Цяпер ужо дыпломаў у кабінеце дырэктара — цэлая сцяна і стос на стале. Трэба думаць, якую вітрыну для іх адвесці альбо зрабіць у калідоры адмысловы стэнд. Тут маюцца адзнакі не толькі прадпрыемства ўвогуле, але і асобных працаўнікоў, спецыялістаў. Але самай важнай узнагародай Тэрэса Валяр'янаўна лічыць сціплы на выгляд дыплом... Ён сведчыць пра атрыманне прэміі спажывецкага прызнання. Яе прысуджаюць у выніку галасавання пакупнікоў, нешта накшталт «кантрольнай закупкі» ў Расіі. Сам вытворца спачатку і не ведае, што яго прадукцыя выстаўлена для ацэнкі спажыўцоў. І тым больш было прыемна, калі паведамілі, што аранчыцкія «Яйкі вясковыя» атрымалі прэмію-прызнанне па выніках мінулага года.

«У АСЯРОДКУ АДНАВЯСКОЎЦАЎ СОРАМНА ПРАЦАВАЦЬ ДРЭННА»

«За гэтым стаіць праца ўсяго калектыву», — так гаварыла дырэктар на цырымоніі ўзнагароджання. Так яно і ёсць. Калектыў у 162 чалавекі забяспечвае сёння работу птушкафабрыкі на 294 тысячы галоў птушкі ў вёсцы Аранчыцы Пружанскага раёна. Прадпрыемства па сённяшніх мерках не вялікае, але галоўная яго адметнасць — яно стабільна працуе і, як цяпер кажуць, устойліва развіваецца. Адна толькі лічба пра многае скажа. Па выніках шасці месяцаў гэтага года сярэдняя заработная плата па фабрыцы склала 5 800 000 рублёў. Любы чалавек, які хоць трошкі ведае сітуацыю ў сельскай гаспадарцы, засведчыць, што гэта вельмі прыстойны паказчык. І ні разу за апошнія пяць-шэсць гадоў гэтую зарплату не затрымалі. Як запісана ў калектыўным дагаворы, так і выплачвалі — строга па чыслах месяца. Людзі ўжо прывыклі размяркоўваць свае траты: плацяжы па крэдытах, узносы за вучобу дзяцей, іншыя абавязковыя выплаты можна рабіць рэгулярна і ў тэрмін.

Для любога працаўніка дзве найважнейшыя пазіцыі — зарплата і жыллё. За апошнія дзесяць гадоў для работнікаў фабрыкі пабудавалі 17 дамоў. Два з іх здалі летась. Адзін выдзелілі маладому спецыялісту — заатэхніку, які прыйшоў пасля заканчэння ВНУ, другі — сям'і, што стаяла ў чарзе на паляпшэнне. Некалькі гадоў таму купілі два прыватныя вясковыя дамы для сваіх работнікаў. Цяпер такіх, хто меў бы вострую патрэбу ў жыллі, няма.

Дырэктар гаворыць, што людзі даражаць работай. Прадпрыемства працуе ў вёсцы без малога паўстагоддзя. Бацькі нярэдка прыводзяць на працу дзяцей. І такім прэтэндэнтам, несумненна, аддаецца перавага. Ёсць ужо цэлыя працоўныя дынастыі, напрыклад сем'і Шчэрбаў, Трацоў, Маргуновых. І хоць сама Тэрэса Валяр'янаўна прыязджая, спецыялістамі стараецца браць менавіта мясцовых. Яна лічыць, што ў асяродку сваіх знаёмых, сваякоў, аднавяскоўцаў сорамна працаваць дрэнна. Ва ўчарашніх школьнікаў Пеці, Васі, Каці ёсць стымул мабілізаваць асабістыя рэзервы і паказаць сябе дарослым, сур'ёзным чалавекам перад сваімі ж суседзямі.

У апошнія гады давялося праводзіць на пенсію многіх спецыялістаў і рабочых, якія адпрацавалі больш як 30 гадоў, значыць, ледзь не ад адкрыцця фабрыкі. Дырэктар кажа, што рабіць гэта было вельмі няпроста. Людзі перажылі самыя складаныя часы прадпрыемства, а былі і такія ў канцы 1990-х — пачатку 2000-х, не звольніліся, не з'ехалі ў горад. І галоўнае, захавалі пачуццё адказнасці за работу, за якасць таго, што робіш, і яшчэ нешта вельмі важнае, што цяжка выказаць словамі, але на чым трымаецца калектыў, можа, яго своеасаблівы маральны стрыжань. Таму і ўзнікалі такія пачуцці.

Дырэктар Тэрэса ДЫБУЛЬ.

На шчасце, традыцыі фабрыкі захоўваюцца і са зменай пакаленняў. «Ёсць многа працаўнікоў, якія перажываюць за работу, здольны бачыць не толькі за паўметра ад сябе», — разважае дырэктар. А кіраўніцтва стараецца ўсяляк добрую работу стымуляваць. На прадпрыемстве маецца прыстойны сацыяльны пакет. Для тых, каму застаецца пяць гадоў да пенсіі, дзейнічае накапляльны фонд. За ўказаны адрэзак часу збіраецца пэўная сума, якой чалавек можа распарадзіцца сам: забраць яе адразу альбо атрымліваць штомесяц як невялікую прыбаўку да пенсіі. Распрацаваны і дзейнічаюць сістэмы страхавання і стымулявання. Аб'яўлена рашучая вайна розным парушэнням дысцыпліны. Тыя, хто мае грэх залішне заглядваць у чарку, усвядомілі, што праверкі алкатэстарам праводзяцца без папярэджання і ў любы час. Таму парушэнні сталі выключэннем.

«Разумная эканомія стала часткай стратэгіі. У нас амаль усе спецыялісты сумяшчаюць пасады».

Праўда, ёсць некалькі чалавек, якіх даводзіцца выхоўваць, браць шэфства брыгадамі і цэхамі. Адна з іх — абавязаная асоба, якая павінна плаціць за ўтрыманне дзяцей. Жанчыну і на работу, здараецца, трэба прыводзіць. Ёсць працаўнік, якога два разы звальнялі, але потым бралі зноў на ўчастак з меншай аплатай і меншай адказнасцю. Цяпер мужчына заказдзіраваўся, зусім не п'е. Ёсць яшчэ адзін, які пражывае сумесна з братам. І зарплата апошняга — адзіны сродак для існавання абодвух. «Можна іх усіх выкінуць за вароты прадпрыемства, і фабрыцы будзе, дакладна, не горш, — разважае Тэрэса Дыбуль. — Але куды падзенуцца гэтыя людзі? Яны пакоцяцца ў самы ніз, пачнуць здабываць сабе ежу крымінальным шляхам, створаць напружанасць у вёсцы. Таму і церпім, і выхоўваем. І працаўнікі мяне, здаецца, разумеюць».

Пытаюся ў дырэктара, ці кожнага яна ведае ў сваім калектыве. Кажа, што кожнага, і не толькі ў твар, але і гісторыю яго сям'і, працоўную біяграфію. Тэрэса Валяр'янаўна працуе тут 11 гадоў, дырэктарам — пяцігодку. За апошнія гады прыйшла да высновы, як важна падтрымліваць карпаратыўны дух. Таму вырашылі праводзіць сваё свята-фестываль у кастрычніку, калі адзначаецца Міжнародны дзень яйка. Кожны цэх, кожнае падраздзяленне рыхтуе сваю праграму: песні, танцы, стравы, прэзентацыі. Культмасавы сектар загадзя ўсё аб'яўляе. І людзі раскрываюцца па-новаму. Ніхто, напрыклад, не ведаў, што сталага ўзросту зваршчык цудоўна выконвае рамансы. А Вікторыя Базылюк, працаўніца склада, наогул артыстка. Пасля аднаго такога мерапрыемства мясцовая настаўніца па сакрэце расказала, што адна з птушніц тэлефанавала ёй і прасіла дапамогі ў складанні оды яйку. Такое заданне было ў праграме свята. Дырэктар парадавалася за тое, як людзі адказна паставіліся да падрыхтоўкі. Многія актыўна ўдзельнічаюць у турзлётах, днях рыбака, іншых спартыўных мерапрыемствах, што праходзяць у раёне. І гэта важна, паводле думкі кіраўніка. Вадзіцелі не бачаць адзін аднаго ў працэсе работы, кожны едзе ў сваім кірунку. А дзень рыбака дае магчымасць для нефармальных стасункаў. А не так даўно ўсе віншавалі Вікторыю, бо яна стала найлепшай сандружынніцай раёна. Людзі павінны неяк сябе праяўляць, раскрываць, тады і працуецца весялей.

«ГРОШЫ МАЕ ТОЙ, ХТО ЎМЕЕ ІХ ЛІЧЫЦЬ»

Сёння Аранчыцкая птушкафабрыка працуе рэнтабельна, без даўгоў і вялікіх крэдытаў. Частка прадукцыі ідзе на экспарт у Расію. За папярэднія гады паспелі на сто працэнтаў памяняць машынна-трактарны парк, правесці рэканструкцыю фактычна ўсёй вытворчасці.

— Лічым кожную капейку, узважваем свае магчымасці. У крэдыты не ўлазім, дзесяць разоў не пралічыўшы. Выжываем за кошт абаротных сродкаў... — задумваецца Тэрэса Валяр'янаўна. — Маем 400 гектараў ворыўных зямель, але гэтага мала для забеспячэння кармавой базы, таму купляем збожжа. Ёсць грошы, бяром адразу многа і па перадаплаце, так атрымліваецца значна танней. Самі гадуем курэй з сутачнага кураняці, самі атрымліваем прадукцыю, самі прадаём, самі развозім спажыўцу. Пра якасць дбаем заўсёды. Каб падтрымліваць сваю марку, клапоцімся пра экалагічна чыстыя кармы, працуем з тымі камбікормавымі заводамі, прадукцыя якіх адпавядае нашым патрабаванням. Многа ёсць складнікаў... Пра калектыў я ўжо гаварыла. Разумная эканомія стала часткай стратэгіі. У нас амаль усе спецыялісты сумяшчаюць пасады. Ну, не можа вясковае невялікае прадпрыемства дазволіць сабе ўтрымліваць асобную адзінку ў якасці эколага, інжынера па ахове працы, намесніка па ідэалогіі. Экалогіяй займаецца аграном, кадры вядзе работнік прыёмнай і гэтак далей. У нас усе ўсвядомілі, што грошы мае той, хто ўмее іх лічыць. А галоўнае прызначэнне прадпрыемства ў вёсцы — даваць людзям работу, зарплату і ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

* * *

Тэрэса Валяр'янаўна нездарма ганарыцца сваім калектывам, у гэтым давялося ўпэўніцца, калі я ўжо адыходзіла і развітвалася. Мяне літаральна абступілі сімпатычныя супрацоўніцы і сталі прасіць, каб я напісала пра іх новую марку: «Мы так старанна абдумвалі назву, спрачаліся і спыніліся на прыгожых беларускіх словах «Хатні сняданак». Абяцала, што пастараюся, адно каб не абвінавацілі мяне ў рэкламе. «А вы прысылайце да нас таго, хто абвінаваціць, — сказала самая бойкая. — Мы яму папулярна патлумачым, што шкодна рэкламаваць, а за што карысна агітаваць, у прыватнасці, калі гэта здаровае харчаванне». І было зразумела, што гэтыя дзяўчаты змогуць пераканаць каго заўгодна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Пружанскі раён.

Іна ІВАНОВА, спецыяліст па продажах.

«УСЁ ЖЫЦЦЁ З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ»

Паштальёнка з Лёзна Ксенія Аляксееўна Дудкіна актыўна агітуе землякоў выпісваць «Звязду». Пазнаёміліся мы з ёй, калі яна прынесла пошту ў Лёзненскі сельвыканкам. Жанчына вельмі ўзрадавалася нечаканай сустрэчы з карэспандэнтам любімай газеты.

— Я абавязкова праглядваю «Звязду» перад тым, як аддаць газету падпісчыкам. Цікавая! Я ж, можна сказаць, усё жыццё пражыла з вашай газетай. А першым у маёй сям'і яе пачаў выпісваць бацька. Такім чынам, сямейнае сяброўства са «Звяздой» пачалося ў 1947 годзе! Сама я родам з Салігорскага раёна. Бацька, які працаваў у калгасе цесляром, і мама — хатняя гаспадыня — выхоўвалі восем дзяцей. На жаль, бацька яшчэ ў савецкі час памёр... Вельмі добры быў чалавек, шчыры прыхільнік «Звязды». Потым я пачала выпісваць. І, паверце, чытала ўсю: ад слова да слова, — распавядае Ксенія Аляксееўна.

На жаль, у яе было вельмі мала часу для размовы, бо спяшалася своечасова прынесці падпісчыкам газеты, часопісы.

— У Лёзненскі раён пераехала, калі замуж выйшла. А потым сястра прыехала ў госці да мяне і таксама знайшла тут сваё каханне *(смяецца)*. У мяне трое дзяцей, трое унукаў, — працягвае жанчына.

На развітанне паабяцала пастарацца, каб падпісчыкаў у найстарэйшай рэспубліканскай беларускамоўнай газеты стала больш.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Лёзна — Віцебск.

Фота аўтара.

ДЫМОК АД ЦЫГАРЭТЫ
павінен біць па кішэні, а не па здароўі

Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае змагацца з тытунёвай эпідэміяй шляхам павышэння падаткаў.

У новым дакладзе арганізацыі адзначаецца, што пакуль толькі 33 краіны ўстанавілі падаткі, якія складаюць больш як 75% рознічнай цаны пачка цыгарэт. У многіх дзяржавах тытунёвыя падатковыя зборы застаюцца вельмі нізкімі. Некаторыя ўрады наогул не абкладаюць тытунёвыя вырабы спецыяльным падаткам.

Генеральны дырэктар СААЗ Маргарэт Чань прывяла ў прыклад вопыт Кітая і Францыі, дзе павышэнне цаны на тытунёвыя вырабы шляхам павелічэння падаткаў прывяло да скарачэння колькасці курцоў і выпадкаў смерці ў выніку раку лёгкіх.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

9 ЛІПЕНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15772)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Ларыса ГРЫБАЛЁВА:

«МОЙ САКРЭТ — У НАТУРАЛЬНАСЦІ»

Летась гэтая артыстка адзначала 20-годдзе творчай дзейнасці, але, пазнаёміўшыся з ёю, разумееш, што яна не страціла свайго запалу. Ларыса Грыбалёва — яркі прыклад чалавека, які ўмее сумяшчаць клопат пра сям'ю з любімай працай, не баіцца прымяраць новыя амплуа і — з надзеяй зрабіць больш, чым учора — чакае новага дня. Ці шкадуе яна пра нешта, чым ганарыцца і чаму лічыць, што жанчына павінна быць слабай, мы пацікавіліся падчас асабістай сустрэчы.

— Нядаўна выйшаў ваш кліп на песню «Забытае шчасце». Гісторыя ў нечым аўтабіяграфічная?

— Задума была ў тым, каб паказаць усе настроі жанчыны. І не абавязкова ў нейкі няўдалы ці шчаслівы перыяд жыцця. Бо эмоцыі мы адчуваем штодзённа — радасць, нянавісць, разгубленасць, абыякавасць. Насамрэч, у кампазіцыі прысутнічае момант аўтабіяграфічнасці, таму што я такая ж жанчына, як і ўсе. Да матэрыялу заўсёды стаўлюся выбарачна і спяваю тое, што мне блізка, можа, таму ў мяне і не дзесяць альбомаў, а толькі два.

— У красавіку вы паказалі сябе ў якасці тэатральнай актрысы. Такі вопыт — толькі эксперымент ці варта чакаць працягу?

— Для мяне, як і для двух іншых удзельнікаў спектакля, — гэта эксперымент. Мы не акцёры і не збіраемся забіраць хлеб у сапраўдных прафесіяналаў. Для нас усё больш падобна да прыгоды, якая дазволіла паспрабаваць сябе ў іншай сферы і атрымаць карысны вопыт. Многія просяць паўтарыць зробленае. Аднак наконт працягу рашэнне павінны прымаць усе ўтраіх, таму пакуль не скажу нічога канкрэтнага. Сам спектакль з'явіўся пасля двухмесячнага рэпетыцыйнага працэсу і стаў вялікім эмацыянальным узрушэннем для мяне.

Звычайна, калі пастаноўка зроблена, то з ёй пачынаюць гастраліраваць альбо ставяць у тэатры нейкі час, але ў нас такой мэты не было. Калі мы і паўторым свой эксперымент, то гэта, верагодна, будуць нейкія гастролі «для сваіх» у Францыі ці яшчэ недзе. На паток ставіць такую працу не збіраемся.

— Гераіня спектакля ў нечым падобная на вас?

— Мне здаецца, што не, хаця кажуць, быццам у нас ёсць нешта агульнае. Мой персанаж — жанчына дзівакаватая, такія моманты ёсць у кожнай з нас, але ў спектаклі раскрываецца вобраз таго, якой яна павінна быць — той адзінай, якая запаўняе ўсё жыццё мужчыны і пра якую немагчыма забыцца, сустрэўшы аднойчы. І, мне падаецца, яе эмоцыі, паводзіны і вобраз наогул тут пададзены вельмі ўтыравана. Усё ў ёй занадта...

— У адносінах «мужчына і жанчына» вам важна адчуваць сябе слабай?

— Думаю, як і любой жанчыне. Мне прыемна і спакойна, калі за мяне прымаюць рашэнні, калі я ведаю, што магу разлічваць на мужчынскую падтрымку і гатоўнасць прыйсці на дапамогу, як раптам спатрэбіцца. Безумоўна, здараюцца выпадкі, калі жанчына выходзіць на першую пазіцыю, але гэта часта не яе жаданне, а жыццёвая неабходнасць. Альбо часам некаторыя самі яе прыдумляюць. Трэба імкнуцца падаваць сябе так, каб мужчыны былі першымі.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Смачна есці

НА КУХНІ НЕ АБЫСЦІСЯ БЕЗ КРЭАТЫВУ

І тады пакаштуем салодкі соус з бульбянога шалупіння

У жніўні ў Бразіліі пройдзе чэмпіянат свету па прафесійным майстэрстве WorldSkills International, які збярэ больш як 1200 канкурсантаў з 63 краін. Студэнт III курса Магілёўскага ўніверсітэта харчавання Мікіта ЦВЯТКОЎ на гэтых спаборніцтвах будзе абараняць гонар айчыннай сістэмы прафесійнай адукацыі ў намінацыі «Кухар». Пуцёўку на прэстыжны конкурс ён заваяваў падчас спаборніцтваў WorldSkills СНД у Казані. Там ён узяў «серабро». Таксама журы пахваліла Мікіту за афармленне страў, крэатыўнасць і лаканічнасць.

ШТО Ў ЧОРНЫХ СКРЫНЯХ?

— У Казані я атрымаў вельмі карысны досвед, — прызнаўся хлопец. — Умовы спаборніцтваў былі максімальна набліжаны да тых, што чакаюць нас у Бразіліі. За дзень да конкурсу нам адкрылі ўсе чорныя скрыні з прадуктамі і далі гадзіну, каб мы напісалі меню. Трэба было прыгатаваць страву з птушкі, тры гарніры і мінімум адзін соус. З гарніраў павінна было быць пюрэ, а з круп прысутнічала экзатычная для Беларусі кіноа — нешта накшталт празрыстых пацерак, якія лопаюцца на зубах, як ікрынкі. Таксама ў абавязковую праграму ўваходзіў мус з садавіны або дэсерт з яе ўтрыманнем. Плюс авалакта — закуска з выкарыстаннем яек і малака.

У першы дзень трэба было прыгатаваць тры стравы і чатыры — на наступны. На гэта адводзілася чатыры і пяць гадзін адпаведна. Мікіта так стараўся, што з усімі заданнямі справіўся датэрмінова. Дарэчы, па ўмовах конкурсу гэта не плюс, а, наадварот, мінус, за што ён і страціў тры балы. А да перамогі яму не хапіла ўсяго 1,39 бала. «Затое я навучыўся разлічваць свой час і ведаю, як распараджуся ім у Бразіліі, — усміхаецца ён. — Пры захаванні той жа хуткасці, што і ў Казані, я змагу зрабіць стравы больш складанымі і цікавымі».

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Не вучобай адзінай

СТУДЭНЦКАЕ ШЧАСЦЕ — ДАХ НАД ГАЛАВОЙ

Ці трэба імкнуцца да 100-працэнтнай забяспечанасці інтэрнатамі?

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Кожны першакурснік, які прыехаў вучыцца ў Мінск з іншага горада, скажа вам, што паступіць у сталічную ВНУ — толькі палова справы. Зусім шчаслівым чалавекам можна адчуць сябе ў тым выпадку, калі атрымаеш у студэнцкім інтэрнаце дах над галавой. Асабліва калі табе пашанцуе трапіць у Студэнцкую вёску...

Забеспячэнне студэнтаў жыллём заўсёды знаходзілася ў цэнтры ўвагі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Таму зусім невыпадкова апошняе пасяджэнне прэзідыума ЦК прафсаюза, прысвечанае маладзёжнай палітыцы, прайшло менавіта ў Студэнцкай вёсцы. Дарэчы, сёння тут заселена ўжо сем з васьмі запланаваных інтэрнатаў. Апошні, што зараз будуецца, прызначаецца для аспірантаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
09 07 2015 г.

СТУДЭНЦКАЕ ШЧАСЦЕ — ДАХ НАД ГАЛАВОЙ

Па найвышэйшым разрадзе...

Першымі сваім жыллём у вёсцы абзавяліся студэнты юрыдычнага факультэта і факультэта міжнародных адносін БДУ. Інтэрнат №11 БДУ ўзводзіла каля тысячы чалавек, у тым ліку на дапамогу былі закліканы і самі студэнты. Ён стаў першым інтэрнатам у нашай краіне, які мае сучасную кватэрную планіроўку.

— У кожным блоку ёсць два пакоі, разлічаныя на пяць чалавек (пакой на два і на тры чалавекі), свая кухня, санвузел і душавая, — расказвае **старшыня Студэнцкага савета інтэрната №4 БДУ Ганна ГАМОРЫНА.** — А ў кожным будынку — свая сталовая, дзе можна танна перакусіць (напрыклад, абед з трох страў каштуе ў межах 15 тысяч), кавярня, медпункт, цэнтры псіхалагічнай службы. Ва ўсіх інтэрнатах ёсць пакоі для самападрыхтоўкі студэнтаў з доступам у інтэрнэт. Гэта вельмі зручна ў час экзаменацыйнай сесіі, бо дазваляе не перашкаджаць сваім суседзям па пакоі. Ёсць пакоі для заняткаў танцамі, ёгай, настольным тэнісам, трэнажорныя пакоі для хлопцаў і дзяўчат, а ў інтэрнаце №4 БДУ ёсць нават більярдная. У інтэрнаце Лінгвістычнага ўніверсітэта дзейнічае цэнтр Інстытута Канфуцыя, дзе ўсе ахвотныя могуць вывучаць кітайскую мову і знаёміцца з культурай гэтай краіны. А ў інтэрнаце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта адзін паверх прыстасаваны для пражывання людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

За жылымі карпусамі размяшчаюцца спартыўны комплекс «Лядовы каток», ёсць стадыён, у прыбудове да інтэрната МДЛУ адкрыўся яслі-сад «Крошкін дом» на 75 месцаў. Першачарговае права на карыстанне яго паслугамі маюць жыхары і работнікі Студэнцкай вёскі. Акрамя таго, на тэрыторыі комплексу размешчаны філіял 33-й студэнцкай паліклінікі, да якой раней даводзілася дабірацца праз увесь горад. Ёсць і бясплатнае стаматалагічнае аддзяленне. Бясспрэчны плюс — наяўнасць паблізу станцыі метро (трапіць у цэнтр горада можна за лічаныя хвіліны), супермаркета, гандлёвага цэнтра і вялікай колькасці крамаў.

Адкрытым застаецца пытанне аб кампенсацыі за наём жылля іншагароднім навучэнцам.

Замежным балельшчыкам, якія падчас правядзення леташняга чэмпіянату свету па хакеі пражывалі ў Студэнцкай вёсцы, складана было паверыць, што ўся гэтая інфраструктура была створана менавіта для навучэнскай моладзі...

Інтэрнат не начлежка

Цікавімся ў Ганны, ці дзейнічае ў інтэрнатах «каменданцкая гадзіна». (Нагадаем, што вясной студэнты мінскіх ВНУ стварылі ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» адкрытую групу «Інтэрнаты 24 гадзіны», дзе размясцілі зварот да міністра адукацыі з заклікам адмяніць абмежаванні на доступ у студэнцкія інтэрнаты ноччу.) Міхаіл Жураўкоў на сустрэчы са студэнцкім актывам прапанаваў, у сваю чаргу, прафсаюзным пярвічкам узяць інтэрнаты пад свой асабісты патранаж і прымаць самы непасрэдны ўдзел у падтрыманні там парадку...

— Каб студэнта не пусцілі ў інтэрнат пасля 23 гадзін, такога

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

ДАВЕДКА

У інтэрнатах першай катэгорыі плата за пражыванне складае для студэнтаў ВНУ 1,2 базавай велічыні, у інтэрнатах другой катэгорыі — 0,8 базавай велічыні і трэцяй катэгорыі — 0,4 базавай велічыні.

яшчэ ў нас не было. Калі ў яго ёсць уважлівая прычына, прапусціць абавязаны. Іншая справа, калі хтосьці вяртаецца ў нецвярозым стане... Пасля 18 гадзін і да раніцы на вахце ў нас дзяжураць прадстаўнікі аператыўнага атрада. Асабіста я лічу, што прапускны рэжым і парадак павінны захоўвацца, — падзялілася сваім меркаваннем Ганна. — Чаму, калі большасць жыхароў інтэрната ўжо адпачываюць, хтосьці будзе вяртацца ў тры гадзіны ночы і перашкаджаць іншым? Аператыўны атрад створаны менавіта для падтрымання ў інтэрнаце правапарадку і садзейнічання ў кантролі за прапускным рэжымам...

— Праца прафсаюзных арганізацый вельмі актыўна праводзіцца ў інтэрнатах усіх ВНУ, — канстатуе **старшыня Каардынацыйнага савета старшыняў прафкамаў навучэнскай моладзі Міхаіл БРЭЙША**, які ўзначальвае прафсаюзную арганізацыю студэнтаў БДЭУ. — Мы ўключаем сваіх прадстаўнікоў ва ўсе ўніверсітэцкія камісіі, дзейнасць якіх закранае пытанні вучэбна-выхаваўчага працэсу і стыпендыяльнага забеспячэння, сацыяльныя і жыллёва-бытавыя пытанні. Маніторым умовы пражывання студэнтаў. Удзельнічаем у распрацоўцы правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах, пажанняў аб засяленні студэнтаў у інтэрнаты, у размеркаванні месцаў... Гэта вельмі важна, паколькі 100-працэнтнай забяспечанасці іншагародніх студэнтаў інтэрнатамі няма, напэўна, ні ў адной сталічнай ВНУ. Важным крокам у вырашэнні гэтай праблемы стала будаўніцтва Студэнцкай вёскі, аднак пытанне недахопу месцаў да гэтага часу цалкам не знята з парадку дня.

— Калі Студэнцкая вёска толькі задумвалася, планавалася, што ўдасца ахапіць інтэрнатамі 85% тых, хто мае ў гэтым патрэбу, — паведаміў **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.** — Але пакуль што ахоп інтэрнатамі складае ў Мінску 76,4%. Для параўнання: у 2011 годзе гэты паказчык складаў у сталіцы ўсяго 55%. Насамрэч, новыя інтэрнаты будуюцца, але на капітальны рамонт закрываюцца зношаныя будынкі. Я задаюся пытаннем, а ці трэба нам імкнуцца да стапрацэнтнай забяспечанасці студэнтаў месцамі ў інтэрнатах? Лічу, што магчымасць мець месца ў інтэрнаце — нядрэнны стымул для таго, каб студэнты падцягвалі сваю паспяховасць. Дарэчы, у 2008 годзе з сацыяльных стандартаў Балонскага працэсу забяспечанасць жыллём студэнтаў была ўвогуле выключана. Калі браць прыклады іншых краін, то ў Грузіі ўсе інтэрнаты ВНУ аддадзены ў камунальны фонд. У Літве інтэрнаты ўвогуле не запоўнены, паколькі там ніхто не хоча плаціць 100% за камунальныя паслугі і студэнту больш выгадна здымаць кватэру. Студэнцкі інтэрнат — не прыватная гасцініца. Ёсць дысцыпліна і правілы ўнутранага распарадку, якіх трэба прытрымлівацца. Гэта трэба тлумачыць студэнтам, асабліва малодшых курсаў...

Пытанні і адказы

Сёння маладыя людзі, якія пражываюць у суперсучасных інтэрнатах у Студэнцкай вёсцы і не карыстаюцца ніякімі льготамі, за дах над галавой плацяць штомесяц 216 тысяч рублёў. Сума, асабліва ў параўнанні з коштам арэнды ў сталіцы, зразумела, смешная. Але студэнтаў хвалюе, што кошт пражывання ў інтэрнатах расце хутчэй, чым памер іх стыпендый.

Пытанні выклікае і тое, што ўсё часцей месцы беларусаў у інтэрнатах займаюць замежныя студэнты, колькасць якіх у апошнія гады істотна вырасла. Працэнт заселеных у інтэрнаты замежнікаў больш высокі, чым сярод беларускіх студэнтаў. У Міністэрстве адукацыі тлумачаць, што на гэта ёсць дзве асноўныя прычыны. Першая з іх — абавязковая рэгістрацыя на тэрыторыі нашай краіны. Згодна з законам «Аб прававым становішчы замежных грамадзянах і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь», адрас рэгістрацыі павінен супадаць з адрасам пражывання. Калі беларускаму студэнту дастаткова зарэгістравацца па адрасе галоўнага навучальнага корпуса, то ў замежнікаў іншая сітуацыя. Другая прычына — бяспека. Першакурснікі, калі прыязджаюць на вучобу, хочуць жыць у інтэрнаце, таму што лічаць гэта больш бяспечным. Акрамя таго, у студэнтаў малодшых курсаў ёсць праблемы ў стасунках, звязаныя са слабым валоданнем рускай мовай.

У некаторых ВНУ колькасць замежнікаў сярод студэнтаў ужо дасягнула 10%, а гэта па словах Віктара Якжыка, мяжа, якую не рэкамендуецца пераходзіць. Да таго ж з прычыны дэмаграфічнай сітуацыі ёсць рэальная пагроза, што праз пяць гадоў студэнцкія інтэрнаты могуць застацца ўвогуле паўпустымі. Але пакуль што тысячы студэнтаў вымушаны самастойна вырашаць праблему з пошукам жылля. Каб часткова змякчыць яе, прафсаюзныя арганізацыі збіраюць і бясплатна прадастаўляюць студэнтам інфармацыю пра адрасы кватэр і пакояў, што здаюцца ў наём.

Дзякуючы намаганням прафсаюза і бюджэтнікі, і студэнты платнай формы цяпер плацяць аднолькава за пражыванне.

Адкрытым застаецца пытанне аб кампенсацыі за наём жылля іншагароднім навучэнцам. Сёння студэнтаў, якія скарысталіся гэтай магчымасцю, у кожнай ВНУ можна палічыць на пальцах адной рукі. І сума кампенсацыі несур'ёзная (памер яе складае 3 базавыя велічыні ў Мінску і 2 базавыя велічыні ў іншых населеных пунктах). І ўмовы для яе атрымання амаль невыканальныя, сярод іх — патрабаванне прад'явіць заключаны з гаспадаром жыллёвай плошчы дагавор, на што апошнія ідуць неахвотна. Таму прафсаюз прапануе прыняць рашэнне аб стварэнні рэальна дзейснага механізма кампенсавання выдаткаў па найме жылля іншагароднім навучэнцам. Вырашыць гэтую праблему можна з дапамогай вызвалення ад падаходнага падатку грамадзян, якія здаюць у наём жылыя памяшканні іншагароднім студэнтам і навучэнцам. Такая прэферэнцыя дзейнічае ў дачыненні да тых, хто прадастаўляе жыллё ў арэнду маладым спецыялістам.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Трыумф найлепшых

ЗА ТВОРЧАСЦЮ І ВУЧОБАЙ — ПОСПЕХ!

Нядаўна Прэзідэнт аб'явіў падзяку групе студэнтаў беларускіх ВНУ. Мы зацікавіліся, а хто ж яны, найлепшыя прадстаўнікі новага пакалення? Пра свае інтарэсы, жыццёвыя перакананні і планы на будучыню нам распавялі трое з узнагароджаных.

Студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Анастасія КЛЕПЧА вучыцца на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва па спецыяльнасці «Бальны танец». Дзяўчына родам з Магілёўшчыны, усё жыццё займаецца харэаграфіяй, танец для яе — галоўная цікавасць і штодзённы занятак: трэніроўкі, рэпетыцыі, падрыхтоўка да турніраў...

— Мне падабаецца даносіць да кожнага гледача свае перажыванні, думкі, эмоцыі і ідэі. У класічным танцы я заўсёды захаплялася харызмай Рудольфа Нурыева, пяшчотай і чуллівасцю Маі Плісецкай, у бальным танцы маім эталонам тэхнікі з'яўляецца Джаана Льюіс, жаноцкасці — Ганна Мельнікава, падачы — Карына Смірнофф, — кажа Анастасія.

У планах на будучыню ў дзяўчыны — самарэалізацыя ў якасці выканаўцы бальных танцаў, спартсменкі (Анастасія прадстаўляе нашу краіну на шматлікіх міжнародных танцавальных турнірах), балетмайстра-пастаноўшчыка і выкладчыка танцаў.

— Падзяка Прэзідэнта — гэта, напэўна, пакуль што самая значная падзея ў маім жыцці, якая запомніцца назаўсёды, — лічыць дзяўчына. — Гэта значыць, што мая добрая вучоба, удзел у навуковых канферэнцыях, перамогі на шматлікіх турнірах не засталіся незаўважанымі.

Студэнтка факультэта беларускай і рускай філалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Вікторыя МЯСЦОВА родам з Мінска. З чатырох гадоў дзяўчына займалася мастацкай гімнастыкай, гэта сфарміравала яе ўпарты характар. Але пасля атрымання разрада кандыдата ў майстры спорту Вікторыя вырашыла скончыць спартыўную кар'еру і зрабіла ўпор на вучобу.

Цяпер дзяўчына займаецца навукова-даследчай дзейнасцю, сфера яе інтарэсаў — праблемы беларускага літаратуразнаўства. У прыватнасці адной з тэм навуковых публікацый былі асаблівасці дэтэктыўнага жанру ў беларускай літаратуры: ад твораў Уладзіміра Караткевіча да сучасных аўтараў, такіх, як Міраслаў Адамчык ці Тэафілія Сабоцкая (пад гэтым псеўданімам піша група аўтараў). Вікторыя актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, з'яўляецца стыпендыятам Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі.

— Вольны час спрабую праводзіць разнастайна: чытаю кнігі, падарожнічаю, — дзеліцца студэнтка. — Мне падабаецца ў выхадны дзень выправіцца ў паездку па цікавых мясцінах Беларусі, прагуляцца па горадзе, у якім раней не была. Любімыя месцы — палац Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі, вуліца Савецкая ў Брэсце, Нясвіж. У найбліжэйшай будучыні планую паступіць у магістратуру. Я хацела б працягваць займацца навуковай дзейнасцю. Сваю вучобу, як і раней, буду сумяшчаць з працай трэнера ў спартыўным клубе.

Дзмітрый НІКАНОВІЧ — студэнт спецыяльнасці «менеджмент СМІ» Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Хлопец нарадзіўся і вырас у Брэсце, з дзяцінства захапляецца музыкай, з'яўляецца лаўрэатам рэспубліканскіх і міжнародных музычных фестываляў і конкурсаў, прадстаўляў БДУ на музычных тэлепраектах. Дзве яго арыгінальныя беларускамоўныя песні — «Ніколі» і «Ключы» — цяпер знаходзяцца ў радыёратацыі.

Не забываецца Дзмітрый і пра вучобу — на яго рахунку ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, публікацыі ў зборніках. Дзякуючы актыўнай даследчыцкай дзейнасці, ён размеркаваўся выкладчыкам у свой інстытут на кафедру гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ, збіраецца працягваць навучанне ў магістратуры.

— Для простага хлопца з Брэста, які калісьці паступіў на журфак, Падзяка Прэзідэнта азначае прызнанне, — кажа Дзмітрый. — Сям'я ганарыцца. Аказалася, што сярод некалькіх тысяч выпускнікоў 50 універсітэтаў краіны на самым высокім узроўні былі адзначаны толькі 15, і я сярод іх. Нечакана і неверагодна прыемна. Перакананы, што ў гэтым заслуга маіх бацькоў і настаўнікаў, якія заўсёды вялі мяне правільнай дарогай. А яшчэ мяне засцерагае мая разумніца і прыгажуня жонка, без якой у мяне б нічога не атрымалася.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Ход канём

БЯСКРОЎНЫ ГРУНВАЛЬД,

або Як ферзь стаў гетманам

Ці любіце вы шахматы? А хнефатафл? Апошняе слова — не памылка, а назва старадаўняй скандынаўскай настольнай гульні, якая ў многім падобная да сучаснай забавы гросмайстраў. Насамрэч, у свеце існуе безліч лагічных дваябор'яў, якія ў рознай ступені нагадваюць любімы від спорту Астапа Бэндара. Японскія сёгі з іерогліфамі, візантыйскія круглыя шахматы, індыйская чатуранга і кітайскія сянцы, у якія можна гуляць утрох, — гэта толькі некалькі прыкладаў. Не так даўно намаганнямі арт-студыі «PRAS» з'явіўся і беларускі варыянт славутай гульні — беларуска-ліцвінскія шахматы. Пра гісторыю іх стварэння мы паразмаўлялі з дырэктарам студыі Мікалаем ТАМАШЭВІЧАМ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Першае, што заўважаеш, гледзячы на дошку беларуска-ліцвінскіх шахмат, — адрозненне ад класічнага варыянта ў памеры: дзевяць на дзевяць клетак (у класічных — восем на восем). У самым цэнтры «трон», поле, якое знаходзіцца ў акружэнні «палаца» — квадрата памерам пяць на пяць клетак. Як «палац», так і «трон» зроблены ў выглядзе прыступак, якія ўздымаюцца над дошкай, як піраміда.

— Гэтыя шахматы літаральна сасніў напрыканцы 1990-х гадоў прафесар Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта Алесь Астроўскі, — распавядае Мікалай Тамашэвіч. — Уначы яму ўявілася, што каманда чмялёў і пчол супрацьстаіць восам і шэршням якраз на такой пляцоўцы. На выбары герояў, відаць, адбілася біялагічная адукацыя Алеся Аляксандравіча. Я тады супрацоўнічаў са «Звяздой», шукаў цікавыя матэрыялы для рубрыкі «Звяздарыначка», вось і натрапіў у інтэрнэце на малюнак з гэтымі шахматамі. Мы сустрэліся з Алесем Астроўскім і вырашылі працаваць над стварэннем гульні сумесна. Я, як больш дасведчаны ў шахматнай стратэгіі і тактыцы чалавек, прапанаваў некаторыя змяненні ў правілах і канцэпцыі, пасля чаго мы прыступілі да распрацоўкі дошкі і фігур.

Дарэчы

Адной з прычын выбару назвы «беларуска-ліцвінскія шахматы» стала тое, што «беларускія шахматы» ўжо існуюць. Такая гульня была створана ў 1989 годзе нашымі суайчыннікамі Мікалаем Грушэўскім і Пятром Шклудавым і ўяўляе з сябе сумесь шахматаў і шашак.

Па словах Мікалая Тамашэвіча, галоўная адметнасць беларуска-ліцвінскіх шахмат заключаецца ў тым, што яны сэнсава «абапіраюцца» на беларускія гістарычныя рэаліі. Два войскі — Вялікага Княства Літоўскага і Тэўтонскага ордэна — змагаюцца за княжацкі трон. Перамогу можна здабыць рознымі шляхамі: у агрэсіўным стылі або амаль бяскроўна, як неаднойчы здаралася ў гісторыі Беларусі. Фігуры захавалі свае ўласцівасці, але змянілі назвы на больш аўтэнтычныя: слоны сталі гарматамі, ладдзі — вежамі, коні — вершнікамі, пешкі — ратнікамі, ферзь — гетманам, кароль — князем. Акрамя таго, з'явілася адна новая фігура — княжыч, які перасоўваецца ў любы бок па гарызанталі, вертыкалі і дыяганалі на адну ці дзве клеткі. У выпадку «смерці» князя гэты герой становіцца яго спадкаемцам.

Задача гульца — захапіць «трон», гэта значыць, заняць цэнтральнае поле і пратрымацца на ім на працягу аднаго ходу. Зрабіць гэта можа толькі асоба каралеўскай крыві — князь ці княжыч. Калі на месцы манарха апынецца любая іншая фігура, яна мусіць пакінуць яго наступным ходам. Акрамя таго, княжыч не можа захапіць «трон», калі князь не знаходзіцца ў «палацы». Думаеце, гэта зусім проста? Мікалай сцвярджае, што пратрымацца ў цэнтры дошкі на працягу аднаго ходу — неверагодна цяжкая задача. Ёсць тут і традыцыйныя сітуацыі шаху і мату, але яны становяцца магчымымі толькі ў выпадку «смерці» адной з каралеўскіх фігур.

— Напачатку мы зрабілі першы драўляны варыянт дошкі, — працягвае Мікалай Тамашэвіч, — ён быў вельмі грубы, непрыгожы. Цяпер захоўваю яго як памяць — на лецішчы. З цягам часу дапрацавалі макет, знайшлі рамеснікаў, якія могуць выканаць усю тэхнічную працу. Пры стварэнні дошкі выкарыстоўваем каштоўныя пароды дрэва: мароны дуб, ясень. Фігуры робяцца з керамікі з дапамогай формаў, дробныя дэталі дабаўляюцца ўручную. Усяго за гэты час зрабілі каля дзесяці набораў, але сабекошт атрымаўся вельмі вялікім. Самы танны каштуе каля 700 долараў, а таму набываюць нашы шахматы даволі заможныя людзі. Зразумела, што пераважна ў якасці сувеніра — дошка ўпрыгожвае інтэр'ер дзе-небудзь у катэджы і выкарыстоўваецца па прызначэнні, можа, пару разоў на год.

Тым, хто жадае пагуляць у беларуска-ліцвінскія шахматы, але не мае лішніх долараў, не варта сумаваць. Ужо зараз хлопцы і дзяўчаты са студыі працуюць над таннейшым варыянтам гульні. Фігуры будуць зроблены з эпаксіднай смалы, а ў якасці дошкі будзе выкарыстоўвацца кавалак ільняной тканіны з разметкай (такім жа чынам зараз выглядае згаданы напачатку скандынаўскі хнефатафл).

Акрамя таго, ужо амаль гатова версія гульні для камп'ютараў. Мікалай Тамашэвіч дэманструе яе інтэрфейс — на галоўным экране быццам бы чакае бою крылаты гусар. Для карыстальніка даступны настройкі, электронны падручнік па правілах і сама гульня: праз інтэрнэт з жывым сапернікам або супраць штучнага інтэлекту. Праўда, вось якраз інтэлекту электроннай версіі нестае — у распрацоўшчыкаў пакуль не атрымалася напісаць сапраўды «разумную» праграмную частку, якая б адказвала за дзеянні камп'ютара падчас гульні. Існуючая версія падыдзе толькі для пачаткоўцаў. Мікалай кажа, што яны будуць рады любой дапамозе з боку праграмістаў.

Асабліва ўражвае дэталёвы ці, лепш сказаць, перфекцыянісцкі падыход каманды да рэалізацыі праекта: для вокладкі гульні на фотасесію запрасілі аднаго з беларускіх акцёраў, спецыяльна для камп'ютарнай версіі была напісана атмасферная музыка. Усе фігуры ў беларуска-ліцвінскіх шахматах таксама распрацоўваліся асобна. Напрыклад, вежа ў войску ВКЛ — амаль дакладная копія Камянецкай, адпаведная фігура ў тэўтонаў нагадвае адну з вежаў замка ў Марыенбургу, колішняй сталіцы Ордэна. Тое самае датычыцца і іншых фігур: іх знешняга выгляду, зброі.

Канчатковая прэзентацыя праекта беларуска-ліцвінскіх шахмат запланавана на восень. У гэты час з'явіцца танны варыянт дошкі, будуць даведзены да ладу сайт гульні і электронная версія, з'явіцца падарункавы набор шахмат. Што ж, пажадаем хлопцам поспехаў у безумоўна вартай ініцыятыве і спадзяёмся, што айчынная гульня знойдзе сваю аўдыторыю як у Беларусі, так і за яе межамі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

Тое, што нас аб'ядноўвае

У ПАДАРОЖЖА... ПА СЛОВА

...Рашэнне было прынята спантанна. Некалькі разоў паглядзеўшы па канале «Беларусь-3» праграму «Размаўляем па-беларуску», падумалі: «А можа, паспрабуем? Чаму б не?» Пасля тэлефоннага званка ў рэдакцыю праграмы высветлілася, што ехаць давядзецца ў Гомель...

Перад намі (мной і маёй сяброўкай Рэнатай Дзяковіч) паўстала цяжкая задача. Трэба было арганізаваць каманду, якая складалася б з трох чалавек. Дарэчы, мы чамусьці думалі, што яна павінна быць толькі з дзяўчат, таму гэта яшчэ больш ускладніла справу. Зусім не ведалі, каго можна ўзяць з намі, хто пагодзіцца на такое падарожжа. Мы пайшлі не па самым лёгкім шляху: праз сецівa шукалі дзяўчыну з Гомеля. Праз пару дзён усё ж такі знайшлі трэцюю ўдзельніцу.

Але калі мы ўжо вырашылі ўсе арганізацыйныя пытанні, зацвердзілі склад каманды, то даведаліся, што з-за нейкіх асабістых праблем трэцяя дзяўчына не можа ўдзельнічаць у праграме. Давялося хутка шукаць замену. Выбар прыпаў на майго брата Сяргея Марцінкевіча. Мы былі ўпэўнены, што ён не адмовіцца ад паездкі. Так і атрымалася.

Калі апынуліся ў студыі, адразу адчулі, што нам былі рады, што нас чакалі. Незнаёмыя людзі клапаціліся пра нас, як родныя. Вядома, дзеці праехалі каля 400 кіламетраў дзеля ўдзелу ў перадачы... Дарэчы, такое стаўленне было да ўсіх удзельнікаў. Гэта было прыемна, настрой адразу падняўся.

У тэлевіктарыне ўдзельнічалі дзве каманды. Нашымі сапернікамі былі два хлопцы і дзяўчына з гомельскай гімназіі №10. Сама віктарына складалася з пяці тураў: прыгадваем, перакладаем, тлумачым, ужываем, цытуем. Таксама трэба было падрыхтаваць назву каманды і візітоўку. Рашэнне гэтых пытанняў мы адклалі да цягніка. Вырашылі: прыдумаем у дарозе. Як аказалася, гэта было больш складана, чым мы палічылі спачатку, але ўсё ж такі назва была прыдумана. Яна склалася з нашых любімых беларускіх слоў. Каханне (слова Сяргея), скарбонка (Рэнаты), дзіўны (маё). Атрымалася назва «Каскад», якую ўсе адразу ўхвалілі.

Прадстаўленне нашай каманды спадабалася і вядучай, і рэдактару, і эксперту-моўзнаўцу. Здаецца мне, што візітоўка была адзіным заданнем за ўсю гульню, якое мы выканалі на выдатна...

У першым туры мы крыху разгубіліся. Трэба было неяк уліцца ў гульню, зразумець, што ды як — мы ж прысутнічалі на здымках перадачы першы раз. Другі тур адыгралі больш-менш добра і нават паверылі ў свае сілы. Значыць, можам, калі захочам, не ўсё так дрэнна, і надзея на перамогу яшчэ ёсць. І яна б заставалася, калі б не трэці тур, які стаў для нас цалкам правальным. Пасля гэтага мы проста працягвалі гуляць, атрымліваць асалоду ад гаворкі па-беларуску, ад прыемнай вядучай, ад цікавых заданняў. Бо ведалі, што лепш узяць ад гэтай гульні ўсё магчымае, пачынаючы з ведаў і заканчваючы эмоцыямі. Супакойвала і тое, што нашу каманду падтрымлівалі, як маглі.

Пасля заканчэння гульні нас пайшлі правесці новыя знаёмыя, а каманда сапернікаў прапанавала сябе ў якасці экскурсаводаў і суправаджала ўвесь астатні час.

Рэната пасля гульні агучыла мне цытату з кнігі: «Тут няма пераможцаў, няма пераможаных. Ёсць толькі тыя, хто змагаюцца». І гэта сапраўды так. Гэтая праграма паказвае, што

галоўнае не перамога, а тое, што нас аб'ядноўвае — родная мова. Няхай ты размаўляеш па-беларуску не вельмі добра, але першы крок ужо зроблены: ты размаўляеш! Мне здаецца, што такія праграмы робяць нашу мову больш папулярнай.

Мы ехалі па прыгоды, новыя пачуцці, знаёмствы. Гэтая вандроўка змясціла ў сабе і вопыт, і незабыўныя моманты, і прагу самастойнасці, і родную мову. Наша каманда (я ўпэўнена, з маімі словамі пагодзяцца Сяргей і Рэната) ні на хвіліну не пашкадавала, што паехала ў Гомель.

«Каскад» яшчэ праявіць сябе. Можа, нават у той жа перадачы «Размаўляем па-беларуску» на тым жа канале, з тымі ж добрымі і шчырымі людзьмі.

Кацярына БУХЦІНАВА, выпускніца 11 класа Бярозаўскай СШ №3 Лідскага раёна.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
09 07 2015 г.

РазМЕРКАВАННЕ

ЦЯГА ДА ЗЯМЛІ,

або «Хімія адказнасці» маладога агранома

Бярэзінскі раён — непаўторны край бясконцых лясоў і палёў... Славутыя беларускія магнацкія роды ва ўсе часы лічылі за гонар мець тут свой надзел зямлі — Сапегі, Тышкевічы, Патоцкія... Нашы карэспандэнты накіраваліся ў госці да маладога спецыяліста, які вось ужо два гады абжываецца на новым месцы, каб дазнацца, як яму там жывецца.

Іван КАЗАК — 24-гадовы галоўны аграном адкрытага акцыянернага таварыства «Брадзец». Сам хлопец родам са Жлобінскага раёна, а ў Бярэзінскім апынуўся па размеркаванні.

Выбар прафесіі ён тлумачыць у першую чаргу тым, што сам вырас у вёсцы. Штолета хлопец падпрацоўваў на зернесушылцы, назіраў, як жыве гаспадарка, і быў больш-менш знаёмы з працай на зямлі. У школе будучы аграном аддаваў перавагу дакладным навукам, асабліва цікавіўся хіміяй, спісваў дзясяткі блакнотаў формуламі, удзельнічаў у алімпіядах і нават меў вольны доступ да школьнай лабараторыі. Пасля школы Іван вырашыў звязаць сваё жыццё з сельскай гаспадаркай і паступіў у Краснабярэжскі дзяржаўны аграрны каледж, потым атрымліваў вышэйшую адукацыю ў Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце.

— Падчас вучобы ў Гродне мне пашчасціла апынуцца ў ліку студэнтаў, што стажыраваліся ў Германіі, — узгадвае Іван. — Да нас прыязджалі дэлегаты з Баварскага сялянскага саюза, якія адбіралі студэнтаў з усіх аграрных ВНУ для працы за мяжой. Я нядрэнна валодаю нямецкай мовай, знаёмы з сельскагаспадарчай тэхнікай, таму выбралі мяне. Так апынуўся ў гаспадарцы, што займалася вытворчасцю лекавых раслін і прадукцыі з іх. Паўгода я жыў і працаваў разам з сям'ёй уласніка. Безумоўна, уражанні засталіся неверагодныя. Спадабалася тое, як там ставяцца да працы — са славутымі нямецкімі педантызмам і адказнасцю.

«Даводзіцца займацца «ўсім і адразу»: аховай раслін, падборам «хіміі», сартавой працай. Замовіць насенне, знайсці пастаўшчыкоў — усё гэта раблю я, таму адказнасць вельмі вялікая».

На размеркаванні хлопцу прапаноўвалі шэраг варыянтаў: аграном — прафесія цяпер запатрабаваная. Але ён спыніў свой выбар на Беразіно. Галоўная прычына — блізкасць сталіцы, да Мінска адсюль можна даехаць за гадзіну. Напачатку Іван трапіў у іншую гаспадарку раёна, што ў вёсцы Паплавы. Але хутка яго забралі ў Брадзец, дзе не было аграномa.

— Калі казаць шчыра, тое, што мяне адразу прынялі на адказную пасаду, прынесла дадатковыя хваляванні, — кажа Іван. — Згадзіцеся, заўсёды прасцей, калі ёсць начальства, якое дзе-нідзе дапаможа, накіруе. Недахоп вопыту — галоўная праблема на новым месцы. Трэба было з першых жа дзён увайсці ў курс спраў і прыняць на сябе ўсю адказнасць. Тым больш што працаваць я пачаў з 20 ліпеня — у разгар уборачнай кампаніі. Тэорыю ведаў добра, а вось практыкі не хапала.

Пераязджаць на новыя месцы Іван прывык: згаданая практыка ў Германіі, студэнцкае жыццё ў Гродне... Таму асаблівых цяжкасцей уладкаванне ў Бярэзінскім раёне яму не прынесла. Спачатку ён жыў у мясцовым інтэрнаце — для маладых спецыялістаў у гаспадарцы выдзелены двухпавярховы катэдж у хвіліне хады ад будынка адміністрацыі. Потым пераехаў за 20 кіламетраў ад гаспадаркі — на здымную жылплошчу ў Беразіно. На працу цяпер ездзіць на ўласным аўтамабілі.

— Агранамічная служба ў гаспадарцы — гэта я і мой падначалены, брыгадзір, — распавядае хлопец. — Даводзіцца займацца «ўсім і адразу»: аховай раслін, падборам «хіміі», сартавой працай. Замовіць насенне, знайсці пастаўшчыкоў — усё гэта раблю я, таму адказнасць вельмі вялікая. Было б зусім шыкоўна, калі б сюды размеркавалі яшчэ і памочніка галоўнага агранома.

Я лічу, што мой выбар прафесіі быў правільным, — рэзюмуе спецыяліст. — Не шкадую, што вучыўся і працую ў сельскай гаспадарцы. Цяжка, безумоўна, але лёгкай працы не бывае...

Не сакрэт, што праца агранома моцна залежыць ад сезона. Лета — час найбольш актыўнай дзейнасці: з раніцы і да позняга вечара Іван знаходзіцца ў полі. Зімой жа — адносны адпачынак і падрыхтоўка да новай пасяўной: выбар угнаенняў, праца з дакументамі. Хлопец кажа, што калі ведаць усю тэхналогію, нічога асабліва складанага ў прафесіі няма. Хоць па першым часе пралікі непазбежныя.

— Сёлета я дапусціў сур'ёзную памылку, — распавядае Іван. — На кукурузе пестыцыд па правілах прымяняецца ў фазе трох-пяці лістоў, але ў час апрацоўкі стаяла вельмі спякотнае надвор'е, і ён не спрацаваў, як трэба. Давялося праводзіць дадатковую апрацоўку раслін...

Заробак у гаспадарцы, па вясковых мерках, неблагі — ад пяці да шасці мільёнаў рублёў. Частка з гэтых грошай ідзе на галоўнае хобі Івана — аўтамабіль. З сябрамі, якія ў маладога чалавека з'явіліся вельмі хутка, ён адпачывае на дыскатэках у райцэнтры. Але і ў Брадцы ёсць чым заняцца: спартыўная зала ў турыстычным комплексе, клуб. Праўда, у вёсцы зусім мала моладзі, і гэта галоўная праблема для тых, хто прыязджае сюды па размеркаванні. Знаходзіць Іван час і на літаратуру, апошняе, што прачытаў, — «Мёртвая зона» Стывена Кінга. Акрамя таго, цяпер хлопец завочна вучыцца ў Вышэйшай школе кіравання бізнесам пры Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце.

— Я лічу, што мой выбар прафесіі быў правільным, — рэзюмуе спецыяліст. — Не шкадую, што вучыўся і працую ў сельскай гаспадарцы. Цяжка, безумоўна, але лёгкай працы не бывае... Хутка заканчваецца маё размеркаванне, і я пакуль не ведаю, што буду рабіць далей. Ужо даўно знаходжуся ў спісе рэзерву кіруючых кадраў, цяпер мне прапаноўваюць стажыравацца і ісці на кіраўнічую пасаду. У любым выпадку, наўрад ці я кіну гаспадарку падчас уборачнай. А далей буду думаць...

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

НА КУХНІ НЕ АБЫСЦІСЯ БЕЗ КРЭАТЫВУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А хваляванне ў рабоце не перашкаджала?

— Як толькі трапіў на кухню, яно тут жа знікла. У нас былі асобныя боксы — у кожнага свая пліта, печ, свае сталы. Адчуваў сябе так, быццам прыйшоў на працу. Нікога вакол не заўважаў, проста працаваў у сваё задавальненне. Так, як умею і магу.

ДАРАСЦІ ДА ЗОРАК МІШЛЕНА

Па сутнасці, у прафесію Мікіта трапіў выпадкова. Прызнаецца, што калі паступаў у каледж на спецыяльнасць «Вытворчасць прадуктаў і арганізацыя грамадскага харчавання», пра сваю будучую працу мала што ведаў. Проста дзевяцікласнік захацеў хутчэй стаць дарослым. Разуменне, што гэта яго справа жыцця, прыйшло, толькі калі пачаліся практычныя заняткі. Каледж скончыў ужо з цвёрдым намерам рухацца ў прафесіі далей. Зараз сумяшчае вучобу з працай кухара ў адным з магілёўскіх рэстаранаў.

Калі я зрабіў ружовую кашу, усе здзівіліся. Пафарбаваў крупу кіноа, прыгатаваную па тэхналогіі італьянскага рызота, бурачковым сокам.

— Яшчэ да чэмпіянату ў Казані я даведаўся пра зоркі Мішлена (яны прысвойваюцца рэстаранам экспертамі (максімум — тры зоркі) і з'яўляюцца для знаўцаў арыенцірам у гастранамічнай геаграфіі. — **Аўт.**). І калі трапіў на стажыроўку ў Італію, быў на сёмым небе ад шчасця, — кажа Мікіта. — Тыдзень мы правялі ў акадэміі Дэль Густа. Наведвалі майстар-класы па класічных і інавацыйных італьянскіх стравах. Сваімі сакрэтамі з намі дзяліліся дастаткова вядомыя ў Паўночнай Італіі кухары. Нам паказвалі, як працаваць з цестам, як гатаваць піцы і пасты, гарачыя стравы. Здзівіла, што на кухні італьянцы практыкуюць навуковы падыход. Там можна сустрэць нязвыклыя для нашых вачэй рэчы — нейкія мензуркі, колбачкі, амаль як у хімічнай лабараторыі. Напрыклад, ёсць спецыяльнае прыстасаванне для надання стравам водару.

«Аднойчы варыў салодкі соус з бульбяных лупін. На смак атрымліваецца нешта накшталт згушчонкі».

Раней заканадаўцам кулінарнай моды была Францыя, а зараз сур'ёзную канкурэнцыю ёй складае Італія. А вось беларускую кухню, на жаль, пакуль не так добра ведаюць у Еўропе, але нашы кухары працуюць над яе папулярызацыяй. І я хацеў бы быць адным з тых, хто будзе яе праслаўляць і ўдасканальваць. Можа тады і да Беларусі зоркі Мішлена дабяруцца?

На конкурсе ў Казані.

РУЖОВАЯ КАША

— Каледж і ўніверсітэт даюць добрую тэарэтычную базу, але вельмі не хапае практычных заняткаў і майстар-класаў ад паспяховых кухараў, — прызнаецца Мікіта. — Калі да нас у каледж прыйшлі кухары з рэстарана Bellagio і пачалі рабіць пасту, я быў здзіўлены. Як можна прыгатаваць «чорную макарону»? Шмат залежыць ад таго, як ты сваю страву падасі. Адзін можа проста засмажыць мяса з бульбай, а другі зробіць з гэтай бульбы нешта такое, што ніхто і не зразумее, што за страва перад ім. У Казані, напрыклад, смак ацэньваўся на 50%, афармленне — на 40%, а 10% складаў крэатыў. Калі я зрабіў ружовую кашу, усе здзівіліся. Пафарбаваў крупу кіноа, прыгатаваную па тэхналогіі італьянскага рызота, бурачковым сокам.

Дэсерт «Малінавы мус».

— А чым збіраешся здзіўляць у Бразіліі? Ведаеш ужо, што давядзецца гатаваць?

— Першы модуль — авалакта-суп, пюрэ або крэм, другі — страва з птушкі (невядома, праўда, з якой). Трэба будзе зрабіць тры гарніры, плюс мінімум адзін соус. Трэцяе блюда — дэсерт з мусам з садавіны, соусам і дэкаратыўным элементам з ізамальта. Потым фрэш-паста, дзе будуць пэўныя інгрэдыенты, стравы з ялавічыны і торт «Чорны лес» (наша «П'яная вішня») у выглядзе разабранага дэсерту. А яшчэ два віды фуршэтных закусак.

ДЭСЕРТ З... АДХОДАЎ БУЛЬБЫ

— Кім уяўляеш сябе ў будучыні?

— Шэф-кухарам уласнага рэстарана сучаснай беларускай кухні ў Беларусі, з філіялам недзе за мяжой, — усміхаецца хлопец.

— Ці ёсць у нашай краіне такія майстры, на якіх ты хацеў бы раўняцца?

— Напрыклад, Аляксандр Петрыман: ён вучыўся ў француза, трымае свой рэстаран. А яшчэ Аляксандр Чыкілеўскі — знаўца славянскай кухні.

Разуменне, што гэта яго справа жыцця, прыйшло, толькі калі пачаліся практычныя заняткі. Каледж скончыў ужо з цвёрдым намерам рухацца ў прафесіі далей.

— Рэцэптам любімай стравы з чытачамі падзелішся?

— Аднойчы варыў салодкі соус з бульбяных лупін. Вельмі смачна, дарэчы. Бульбяныя лупіны смажацца ў алеі да стану чыпсаў, потым заліваюцца вяршкамі ў прапорцыі 2:1 і ў даволі вялікай колькасці цукру варацца на самым малым агні дзве гадзіны. На смак атрымліваецца салодкі соус, нешта накшталт згушчонкі.

— У сям'і сам будзеш гатаваць?

— Не, гатаванне для мяне найперш за ўсё асацыюецца з працай. Дома і прасторы для творчасці не хапае, і цяжэй потым наводзіць парадак. Да таго ж я люблю гатаваць у цішыні і без старонніх назіральнікаў.

— А чым яшчэ захапляешся?

— Нядаўна зрабіў дзве талеркі з гліны, мне падабаецца незвычайны посуд для страў. Талеркі ў выглядзе, напрыклад, галінак. Аднойчы купіў у магазіне гліну і пад бацькавым кантролем пачаў ляпіць. Вось ён у мяне сапраўдны майстар.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by
Фота аўтара і з архіва Мікіты ЦВЯТКОВА.

Агульная мова

КАЛІ ХОЧАШ ЗАСТАЦЦА...

Як кітайцу жывецца і працуецца ў сінявокай

Штогод тысячы маладых замежнікаў становяцца студэнтамі беларускіх ВНУ. Пасля атрымання дыплома яны, як правіла, вяртаюцца на радзіму, але ёсць і выключэнні. Напрыклад, аспірант БДУ Ван Шывэй дадому ў кітайскі горад Чанчунь пакуль не збіраецца. Хлопец расказаў пра свае мінскія будні, падзяліўся назіраннямі наконт нашай адукацыі і адзначыў найлепшую, на яго думку, якасць беларусаў.

Пра Беларусь Ван Шывэй упершыню пачуў у школе на ўроках сусветнай гісторыі. Яму проста стала цікава, дзе знаходзіцца той самы Брэст, у якім падпісалі Брэст-Літоўскі мірны дагавор. Прыехаць вучыцца да нас хлопец вырашыў пасля таго, як даведаўся, што адной з дзяржаўных моў тут з'яўляецца руская. Да таго ж прывабілі кошты на адукацыю: у параўнанні з Расіяй яны ніжэйшыя.

Са сваіх першых уражанняў ад Беларусі Ван Шывэй прыгадвае наступныя: «Мінск мне адразу спадабаўся сваёй чысцінёй, зелянінай. І незвычайная цішыня здавалася ўрачыстай. Складана было паверыць у тое, што гэта сталіца! Калі ўбачыў беларускія грошы, быў у шоку ад колькасці лічбаў. «Няўжо стаў мільянерам?» — думаў я тады. Яшчэ было дзіўным тое, што ў грамадскім транспарце трэба прабіваць талончык. У Кітаі няма такога кантролю за безбілетнікамі, ды і кандуктара вельмі рэдка можна сустрэць. Цяпер я ведаю, што да чаго, і заўжды купляю праязны білет, «зайцам» не езджу».

Ван Шывэй, як і большасць замежнікаў, якія вучацца ў БДУ, жыве ў інтэрнаце. На яго думку, гэта дае цудоўную магчымасць для моўнай практыкі.

— З беларускімі студэнтамі жыць весела і цікава. Я спецыяльна да гэтага імкнуўся ўвесь час. Напэўна, таму тут у мяне сяброў з Беларусі больш, чым з Кітая. Мае суседзі дапамагалі мне прызвычаіцца да ўсяго па першым часе, і рабілі гэта абсалютна бескарыслівa. Увогуле, людзі ў вас спагадлівыя, хаця, зразумела, усякае здаралася. Але інтэрнатаўскія дні — найлепшыя ў маім жыцці, — з упэўненасцю сцвярджае аспірант.

Хлопец не шукае адрозненні паміж беларусамі і кітайцамі, наадварот, спрабуе знайсці нешта агульнае ў дзвюх нацый. «Карысна больш ведаць пра іншыя культуры, пра непадобных да цябе людзей. Такія страшныя рэчы, як расізм, нацызм узнікаюць з прычыны няведання», — тлумачыць ён сваю пазіцыю.

Да вучобы Ван Шывэй ставіцца надзвычай сур'ёзна. Пра гэта сведчыць яго ўпэўненае валоданне рускай мовай. Акрамя гэтага, хлопец мае дыплом магістра з адзнакай: «Калі я яго атрымаў, у маім сэрцы з'явілася радасць, таму што ён стаў доказам маіх ведаў. Значыць мая праца не была дарэмнай. Многія знаёмыя беларусы скардзяцца на тое, што ў вас складана вучыцца, але калі б яны павучыліся ў Кітаі, то абавязкова захацелі б назад. У вас ціск у плане вучобы меншы, чым на маёй радзіме. Але якасць ад гэтага не горшая, выкладчыкі ва ўніверсітэце (асабліва выкладчыкі моў) вельмі адказна ставяцца да сваёй працы».

«У дзяцінстве марыў стаць пісьменнікам, хацеў сваёй творчасцю змяніць свет. Калі вырас, зразумеў, што спачатку трэба мяняць сябе».

Ван Шывэй і сам звязаў сваё жыццё з выкладчыцкай дзейнасцю: паралельна з аспірантурай ён працуе ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы. Хлопец адзначае невялікую заработную плату тых, хто працуе ў сферы адукацыі, і ўспамінае адну са сваіх калег, якая па гэтай прычыне стала прадаўцом у супермаркеце. Аднак грошы для Ван Шывэя не галоўнае ў жыцці. Ён шчыра не разумее моладзь, якая не імкнецца да навукі:

— Мне сумна, калі заўважаю абыякавасць студэнтаў да вучобы або даведваюся, што выпускнікі школ нават не спрабуюць паступіць у каледжы ці ВНУ, а адразу ідуць працаваць. Я ж выкладчык, таму і не магу пра гэта не думаць.

Хлопец не забываецца на сваю родную культуру, заўсёды адзначае кітайскія святы. Аднак і да нашых ужо прызвычаіўся. Сярод любімых беларускіх свят Ван Шывэй вылучыў Масленіцу і Купалле.

Радасных момантаў у працы Ван Шывэя таксама хапае: «Раней я выкладаў кітайскую мову ў БДУ. Калі прымаў экзамен па гэтым прадмеце, заўважыў, што некаторыя студэнты намалявалі складаныя для запамінання іерогліфы на руцэ. І хаця я супраць «шпаргалак», гэта выглядала так міла! Увогуле, мне падабаецца бачыць, што студэнты намагаюцца ісці наперад, нават дапускаючы памылкі.

У вольны час Ван Шывэй любіць вандраваць па Беларусі. Ён сядае ў маршрутку і едзе ў маленькія гарады. Ён любіць бываць на прыродзе, фатаграфаваць беларускія краявіды. Падчас такіх вандровак Ван Шывэй звычайна купляе бульбу і казінае малако.

— Па-за Мінскам жывуць неверагодна гасцінныя людзі! Яны давалі мне, незнаёмцу, пакаштаваць яблыкі са свайго саду, мёд... Мінчане, напэўна, не такія, некаторыя з іх нават не ведаюць, як завуць іх суседзяў, — дзеліцца сваімі назіраннямі хлопец.

Акрамя гэтага, Ван Шывэй гуляе ў настольны тэніс, ходзіць у бібліятэку, малюе. Таксама ён піша вершы і прозу. На яго старонках у сацыяльных сетках можна знайсці шмат заметак, апавяданняў на вельмі розныя тэмы — ад лірычных замалёвак да сур'ёзных разважанняў. Беларускія сябры хлопца і нават незнаёмыя людзі актыўна каментуюць гэтыя творы. «Гэта дапамагае мне, як аўтару. Аднойчы я параўнаў светлую скуру дзяўчыны з вараным яечным бялком, але пасля мне растлумачылі, што ў вас такія параўнанні не прыняты». Запісы ў асноўным Ван Шывэй робіць па-руску, але час ад часу трапляюцца сказы і на беларускай мове. Аспірант лічыць: «Калі прыехаў у чужую краіну, дык трэба разумець яе мову».

Хлопец не забываецца на сваю родную культуру, заўсёды адзначае кітайскія святы. Аднак і да нашых ужо прызвычаіўся: спачатку адзначае каталіцкае Раство, пасля — Новы год, затым — Раство праваслаўнае, далей — стары Новы год і напрыканцы — Новы год па ўсходнім календары. Сярод любімых беларускіх свят Ван Шывэй вылучыў Масленіцу і Купалле.

— Канкрэтных планаў на будучыню ў мяне пакуль няма, — прызнаецца малады чалавек. — Раней думаў, што да дваццаці сямі гадоў знайду сабе жонку і мы разам будзем вырашаць, у якім напрамку рухацца далей, але я пакуль у актыўным пошуку «той самай дзяўчыны»... У дзяцінстве марыў стаць пісьменнікам, хацеў сваёй творчасцю змяніць свет. Калі вырас, зразумеў, што спачатку трэба мяняць сябе. Чалавек павінен захоўваць дабрыню, імкнуцца да прыгажосці і любві, пастаянна самаўдасканальвацца. Беларусы маюць цудоўныя рысы характару — яны простыя, адкрытыя! Нават Леў Талстой лічыў, што гэта неабходная ўмова для стварэння прыгожага. Вельмі хочацца, каб вы не гублялі гэтыя якасці.

Ганна КУРАК,
студэнтка III курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Нябачныя масты

ІМПАРТ ВЕДАЎ

Што замежныя студэнты шукаюць і знаходзяць у нас?

Ужо даўно не рэдкасць, калі выпускнікі беларускіх школ едуць атрымліваць вышэйшую адукацыю за мяжу. Нікога не здзіўляе і тое, што замежнікі прыязджаюць вучыцца да нас. Чаму яны выбіраюць Беларусь? Што ім падабаецца ў нашай краіне, а чаго не хапае? На гэтыя і іншыя пытанні адказваюць замежныя студэнты БДУ.

Выкладчыкі сталі сябрамі

Пяцікурсніца філалагічнага факультэта Зейнэп Джашкун (Турцыя, г.Анталія) прыехала ў Мінск амаль шэсць гадоў таму. Яна ніколі не ставіла сабе за мэту вучыцца за мяжой. Такое рашэнне прыняў бацька дзяўчыны, калі ў яе не атрымалася паступіць ва ўніверсітэт на радзіме.

— Тады я нічога не ведала пра Беларусь, але мяне гэта не пужала. Вучыцца я ехала не адна — разам са стрыечнай сястрой Эмінэ. Акрамя таго, нашы бацькі вырашылі, што будзе лепш, калі наш старэйшы брат некаторы час пажыве ў Мінску, прыгледзіць за намі, пакуль мы не прывыкнем.

Зейнэп і Эмінэ атрымалі месцы ў інтэрнаце, але адмовіліся ад іх. Турчанкі былі вельмі здзіўленыя тым, што хлопцы і дзяўчаты жывуць у адным будынку, у іх так не прынята. Але з часам яны зразумелі, што нічога страшнага ў гэтым няма, і цяпер жывуць у інтэрнаце. Праўда, бацькам пра гэта не расказваюць.

Першы навучальны год дзяўчаты з нуля вывучалі рускую мову на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі.

— Тады мы не маглі ні з кім пазнаёміцца, бо не ведалі мовы. Жылі на кватэры, а гэта абмяжоўвала нас яшчэ больш у плане кантактаў, — успамінае Зейнэп.

Усё змянілася, калі сёстры Джашкун паступілі на філфак. Турчанкі трапілі ў групу, дзе ўсе былі такімі ж, як яны: крыху разгубленымі замежнікамі, якія не вельмі ўтульна адчувалі сябе ў чужой краіне.

Універсітэцкія гады надоўга запомняцца Зейнэп. Яна двойчы прымала ўдзел у конкурсе «Міс Інтэрнэшнл БДУ», удзельнічала разам з сябрамі ў тэатральных пастаноўках замежных студэнтаў.

— Нам неверагодна пашанцавала з выкладчыцай рускай мовы. Кацярына Аляксандраўна Варанцова не толькі дапамагала вучыцца, але і рабіла ўсё магчымае, каб наша жыццё ў Беларусі было насычаным і цікавым. Дзякуючы ёй за пяць курсаў наша група пабывала ва ўсіх вялікіх і многіх маленькіх беларускіх гарадах, — расказвае Зейнэп і паказвае фотаздымкі.

Адносіны з беларускімі выкладчыкамі ў турчанак склаліся нават сяброўскія. Зейнэп узгадала, як аднойчы зімой сур'ёзна захварэла, збіралася нават дадому ехаць. Але тады б узніклі праблемы з вучобай.

— Выкладчыца Людміла Іванаўна Строк прапанавала некаторы час пажыць у яе, даглядала мяне, купляла неабходныя лекі.

Хутка Зейнэп і Эмінэ вернуцца дадому. Праблем з працаўладкаваннем у іх дакладна не ўзнікне: спецыялісты з валоданнем рускай мовы ў Турцыі запатрабаваны.

«Вашы хлопцы — рамантыкі»

Першае, на што звярнула ўвагу ў Беларусі Білікэ Саймэйці (Кітай, г. Урумчы) была чысціня паветра. У дзяўчыны алергія, з-за гэтай хваробы ў родным горадзе яна рэдка выходзіла на вуліцу.

— Толькі ў Мінску я пачала весці актыўны лад жыцця: палюбіла прагулкі пешшу, заняткі спортам. Цяпер мне цяжка ўседзець на адным месцы, — расказвае дзяўчына.

У Білікэ шмат сяброў і сярод беларусаў, і сярод замежнікаў. Праўда, з'явіліся яны не адразу. Студэнтка тлумачыць, што моўны бар'ер першым часам быў сур'ёзнай перашкодай для стасункаў. Затое вывучэнне рускай мовы на філафаку з нуля вельмі зблізіла Білікэ з яе аднагрупніцамі Зейнэп і Эмінэ. Праз тое, што дзяўчаты паўсюдна хадзілі ўтрох, выкладчыкі жартаўліва пачалі называць кітаянку «трэцяй Джашкун».

На факультэце многія ведаюць Білікэ як творчую асобу. Яна добра спявае і неаднаразова ўдзельнічала ва ўніверсітэцкіх канцэртах. Аднойчы Білікэ давялося нават выступіць на Дні горада ў адным з райцэнтраў Мінскай вобласці.

Араш Тахеры, Зейнэп Джашкун, выкладчыца Кацярына Варанцова і Білікэ Саймэйці.

Білікэ настолькі прызвычаілася да Беларусі, што ўжо не хоча вяртацца дадому. Яна рыхтуецца да паступлення ў магістратуру і шукае працу. Таксама студэнтка не выключае магчымасці звязаць свой лёс з беларускім хлопцам: «Беларусы — рамантыкі. Я назірала за тым, як яны заляцаюцца да дзяўчат. Так прыгожа, міла, пяшчотна. Выйсці замуж за беларуса? Чаму б і не?»

Драйв у 20 літрах... баршчу

Для 29-гадовага пяцікурсніка філфака Араша Тахеры (Іран, г. Тэгеран) навучанне ў БДУ — добра прадуманы крок у жыцці. Іранец ужо мае адну вышэйшую адукацыю.

Пасля заканчэння школы Араш хацеў займацца камп'ютарным праграмаваннем, таму што яго бацька працуе ў гэтай сферы. На радзіме хлопец атрымаў дыплом па спецыяльнасці «праграміст», аднак гэтая прафесія там не вельмі запатрабавана. Тады ён вырашыў паспрабаваць свае сілы ў гуманітарных навуках.

— Вучыцца прыехаў менавіта ў Мінск, таму што мая маці — перакладчык у беларускім пасольстве Ірана, — тлумачыць свой выбар Араш. — Думаю, што ў гэты раз з выбарам прафесіі не памыліўся. Люблю размаўляць і рускую мову засвоіў добра. Што яшчэ трэба перакладчыку?

Ёсць сярод студэнтаў БДУ расіяне і ўкраінцы. Напрыклад, сёстры-двайняты Кацярына і Лізавета Варажбіт (Украіна, г. Марыупаль) вучацца ў нас ужо другі год. Першая — на факультэце міжнародных адносін, другая — на журфаку.

— Адчуваецца, што ў Беларусі клапоцяцца пра студэнтаў. Калі мы ўпершыню ўбачылі навучальныя карпусы факультэтаў міжнародных адносін і журналістыкі, то былі прыемна здзіўлены — усё такое сучаснае і прыгожае! — расказвае Каця.

Калі многіх замежнікаў вабіць спакой і адносная цішыня Мінска, то для дзяўчат з Марыупаля гэта наадварот адзін з мінусаў. На іх думку, беларускай сталіцы не хапае драйву. Але ўкраінкі ніколі не сумуюць і час дарма не губляюць. Напрыклад, не так даўно Ліза разам з сябрамі з факультэта зварыла ў інтэрнаце... 20 літраў баршчу.

Ганна КУРАК,
студэнтка III курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 24 июля 2015 года повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)	Пристройка (ремонтные мастерские), литер Г1/К, инвентарный № 500/С-8527, площадь 481 кв. м, год постройки 1954, расположено по адресу: г. Минск, проезд Бетонный, д. 5а; Здание специализированное иного назначения (мойка), литер Д1/бл, инвентарный № 500/С-44158, площадь 169,9 кв. м, год постройки 2002, расположено по адресу: г. Минск, проезд Бетонный, д. 3.
Начальная цена	4 168 350 384 белорусских рубля
Сумма задатка	416 000 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22
Балансодержатель (должник)	ООО «МИНДАВГ»

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **24 июля 2015 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 09.07.2015 по 22.07.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 327-48-36, 327-40-22 (УП «Минский городской центр недвижимости»).

Гродненский городской исполнительный комитет

ПРЕДЛАГАЕТ ПРИОБРЕСТИ гостиничный комплекс «Гродно»,

расположенный в г. Гродно, ул. Поповича, 5.

За 74 млрд. руб. предлагаются 16-этажное кирпичное здание гостиницы, 1984 года постройки, площадью 12741 кв.м и 3-этажное здание ресторана «Гродно», 1985 года постройки, площадью 3471,0 кв.м.

За дополнительной информацией обращаться в отдел коммунального имущества и приватизации Гродненского городского исполнительного комитета по тел. 8-0152 74 14 42. УНП 500048360

О Б Ъ Я В Л Е Н И Е

УНП 100074393.

22 июля 2015 г.

СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Камволь»

Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4 этаж главного корпуса.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Камволь».
2. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, ком. 204, тел.: 223 14 20, 2-97.

Начало работы собрания – 10.00 часов.

Регистрация участников собрания с 08.45 до 09.45 мин.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01.07.2015 года.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Дабрабыт» (Продавец)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ ПО ПРОДАЖЕ амбулатории (инв. №621/С-47455) площадью 157,2 м² и гаража (инв. 621/С-47456) площадью 52,7 м²,

расположенных по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, Ланский с/с, аг. Лань, ул. Советская, 75А.

Земельный участок площадью 0,1093 га с кадастровым номером 624282003601000315. Целевое назначение – обслуживание здания амбулатории. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена с НДС – 174 735 360 бел. руб.
Задаток – 17 473 536 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Дабрабыт», **проводимом 21 июля 2015 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **21.07.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 17.07.2015 до 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.04.2015. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **www.ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Утерянный студенческий билет № 1429029 на имя АРТЕМОВА Артема Михайловича **считать недействительным.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703.**
Продавец	**Унитарное предприятие «Молодечненский пищевой комбинат», г. Молодечно, ул. Л. Роменская, 62.**
Предмет аукциона	
Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-16625, общей площадью 469,2, кв.м. Наименование: Здание квасильно-засолочного пункта. Назначение: Здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака. Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, 62.	
Начальная цена с НДС (снижена на 35%) – 1 465 920 000 бел.руб.	
Сведения о земельном участке: площадью **0,3126 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания специализированного для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (квасильно-засолочный пункт) с установленными ограничениями – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0.0546 га.	
Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».	
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.04.2015 г.	
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.	
Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**	
Аукцион состоится **10.08.2015** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.08.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.	

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71. auction@cpo.by

Информация о проведении открытого аукциона 2 лотами по продаже недвижимого имущества: ЗДАНИЕ СКЛАДА И ЗДАНИЕ АДМИНИСТРАТИВНО-ХОЗЯЙСТВЕННОЕ

Адрес объектов и их наименование:	Капитальное строение (здание склада, инв. № 645/С-6624) площадью 520,6 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Колхозная, 33. Снижена первоначальная цена продажи имущества на 20%, что составляет 845 898 240 (восемьсот сорок пять миллионов восемьсот девяносто восемь тысяч двести сорок) белорусских рублей (с учетом НДС 20%). Капитальное строение (административный корпус) площадью 1447,8 кв.м (инв. № 640/С-61959) с объектами: здание административно-бытовое (инв. № 1001), котел газогенераторный водогрейный (инв. № 413933), котел газогенераторный водогрейный (инв. № 41392), асфальтовая дорожка с бордюрным камнем (инв. № 2020), тротуар из тротуарной плитки перед АБК (инв. № 2021), расположенное по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 1. Снижена первоначальная цена продажи имущества на 20%, что составляет 5 839 139 328 (пять миллиардов восемьсот тридцать девять миллионов сто тридцать девять тысяч триста двадцать восемь) белорусских рублей (с учетом НДС 20%).
Продавец:	ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2»
Порядок оплаты:	Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и публикацией объявления в СМИ. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 30-ти банковских дней со дня проведения аукциона.
Сумма задатка:	*10% от начальной цены объекта (лота) с учетом (НДС) на р/с 3012462470015 в РКЦ № 42 филиала ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление, код 942, г. Слуцк, ул. Копыльская, 7 УНП 601070249, ОКПО 031217156014 Получатель: Филиал «Автобусный парк № 2»*
Организатор аукциона:	ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2», 223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4
Документы, предоставляемые для участия в аукционе:	Копия платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка в размере 10% от начальной цены объекта (лота) (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток 10% от начальной цены объекта согласно Условий проведения аукциона с НДС.»)
Конечный срок и адрес приема заявок:	06.08.2015 г. до 16.00 по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4 Филиал «Автобусный парк № 2», тел. 8-0179545085, факс: 801795 46477
Дата, время и место проведения аукциона:	07.08.2015 г. в 10.00 по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4

ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 8»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Номер лота	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
Лот №1	**Универсальный измельчитель древесных отходов WLH 800S 45 Tiger, 2008 г.в., инв. № 71**	289 408 320	28 940 832
Местонахождение объекта	224028, г. Брест, ул. Гоздецкого, 16		
Условия продажи	Без условий		
Продавец (Балансодержатель)	ОАО «Строительный трест №8»		
Организатор торгов	ОАО «Строительный трест №8»		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 10-ти рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона		
Шаг аукциона	5% от начальной цены лота		
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи		
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012121884440 в Региональной Дирекции № 100 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, получатель платежа ОАО «Строительный трест № 8»		
Аукцион состоится 21 июля 2015 г. в 11.00 по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, зал заседаний ОАО «Строительный трест № 8» каб. 230, 231			

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ОАО «Строительный трест № 8».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, каб. 418 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Последний день приема заявлений – 20 июля 2015 г. до 12.00.

Контактный телефон организатора аукционных торгов: 8-(0162)- 22-01-72.

Карыснае хобі

ПАД БРЭНДАМ «СВАЁ»

Рукадзелле зноў набывае папулярнасць

Заняткі па працоўным навучанні ў нашай школе штогод праходзілі па аднолькавым сцэнарыі. Першую чвэрць мы кулінарылі, у астатнія — «прыручалі» швейную машынку (бачылі б вы гэтыя ледзь не дарэвалюцыйныя агрэгаты!). З гатаваннем я «не пасябравала» з самага пачатку. Іншая справа — рукадзелле.
Валодаць іголкай і спіцамі мяне некалі навучыла маміна знаёмая, таму сурвэткі-шалікі-ручнікі я майстравала не толькі на школьных занятках, але і ў вольны час дома. Праўда, не прызнавалася сябрам. Не па-маладзёжнаму гэта было — вышываць увечары крыжыкам.

У студэнцкія гады сапраўднай знаходкай сталі часопісы з выкрайкамі. Тое, што трэба, калі канструяваць адзенне не ўмееш, а пашыць нешта па фігуры вельмі хочацца. Ледзь не кожны месяц частка маёй стыпендыі заставалася ў крамах, дзе прадавалі тканіну. Рабіла блузкі, спадніцы, сукенкі... Не ўсё атрымлівалася, вядома. Дагэтуль у кутках шафы сарамліва хаваюцца ні разу не апранутыя вырабы. Затое кожная ўдалая рэч прыносіла камплімент ад сябровак і ўпэўненасць у тым, што больш ніхто з тваіх сакурсніц не прыйдзе ў такім жа строі.

Даўно заўважыла, што колькасць аматараў рукадзелля сярод сучасных дзяўчат павялічваецца. Напрыклад, **Даша ПУЗЫРОВА** — эканаміст па адукацыі. Па спецыяльнасці дзяўчына працаваць так і не пайшла: захапілася перынатальнай псіхалогіяй (галіна, якая даследуе псіхічнае жыццё ненароджанага дзіцяці ці немаўляці) і вырашыла змяніць прафесію. Цяпер Даша завочна атрымлівае другі дыплом, а ў вольны час шые сабе адзенне. Майстраваць вучылася сама, шляхам спроб і памылак. «Глядзела, як мама рабіла адзенне для сябе, а потым у сеціве натхніла дзяўчына-рамесніца», — прыгадвае яна. Лёгкія баваўняныя тканіны ў кветкі і гарошак — Дашына слабасць. Будучы псіхолаг аддае перавагу доўгім спадніцам. «У нас доўгія сукенкі, такія, каб цалкам задавальнялі, купіць праблематычна. А так — выбрала тканіну, якая спадабалася, прадумала фасон і пашыла», — тлумачыць яна свой выбар.

Даша часта ходзіць у сваіх строях і да камплімента ад знаёмых ужо прывыкла. «Сябры ўгаворваюць паўдзельнічаць у мінскіх фэшн-маркетах, але я да гэтага яшчэ не дарасла, напэўна. Магчыма, у будучыні паспрабую», — сціпла прызнаецца дзяўчына. Пачуўшы пытанне «Ці не думала ператварыць сваё хобі ў працу?», майстрыха задумалася: «Каб зрабіць гэта заробкам, трэба або наймаць работнікаў, або самой шыць бесперапынна, што асабіста для мяне непрымальна. Такая дзейнасць будзе, хутчэй, стамляць. Хаця попыт на працу рамеснікаў штогод расце, бо для многіх важная індывідуальнасць і цеплыня, якая закладзена ў хэнд-мэйд рэчах».

Сёлетняя выпускніца біялагічнага факультэта БДУ **Насця СТАДНІКАВА** захапляецца вязаннем і вырабляе цёплыя капелюшы і шалікі на заказ. Дзяўчына распавядае, як у дзяцінстве бегала з іголкай па доме і сшывала кавалачкі тканіны ў адзенне для лялек. «Пасля ўбачыла, як бабуля вяжа кручком, і папрасіла навучыць. Мне тады было сем гадоў. Атрымалася не адразу. І пальцы балелі, і перарабляла адно і тое ж па некалькі разоў, і мора слёз было, але не здавалася. Першай маёй працай стала маленькая сумачка, 10 на 10 сантыметраў, цераз плячо. Потым я вязала падобныя сумкі аднакласніцам на дні нараджэння».

Фота з архіва Анастасіі СТАДНІКАВАЙ.
Выпускніца біяфака Насця СТАДНІКАВА носіць усё сваё.

«І пальцы балелі, і перарабляла адно і тое ж па некалькі разоў, і мора слёз было, але не здавалася. Першай маёй працай стала маленькая сумачка, 10 на 10 сантыметраў, цераз плячо».

Цяпер Насця з дапамогай кручка і спіц вырабляе самыя розныя рэчы: шкарпэткі, кофты, галаўныя ўборы, аксесуары для дома. «Не хачу паказацца самаўпэўненай, але для мяне не існуе складаных работ у вязанні, — кажа яна. — Усё ж такі стаж — 15 гадоў». Працуе дзяўчына хутка. На пару шкарпэтак ідзе 6-7 гадзін, на зімовы камплект (капялюш, шалік, рукавіцы) — паўтара дня. А за тры дні майстрыха паспявае звязаць стандартную кофту без узораў.

Спачатку Насця вязала толькі для сябе і блізкіх. Гартала модныя часопісы, шукала рэчы, якія яшчэ не з'явіліся ў продажы ў крамах. Потым пачала рыхтаваць самаробныя падарункі прыяцелям, а праз колькі часу замаўляць вязаныя рэчы сталі знаёмыя знаёмых. Дзяўчына нават не заўважыла, як хобі перарасло ў падпрацоўку. У асноўным заказы паступаюць восенню і ўзімку. «Мне падабаецца ствараць праз свае рэчы ўтульнасць. Парады рамеснікам-пачаткоўцам? Набярыцеся цярплівасці і ніколі не адступайце ад сваіх ідэй. Атрымлівайце задавальненне ад працы, тады ўсё будзе выдатна».

Чаму рукадзелле зноў стала папулярным? Дзесьці гэта спосаб сэканоміць на пакупках. Хаця з улікам кошту швейнай машынкі (у сярэднім 300 долараў), курсаў па кройцы і шыцці (два месяцы навучання абыдуцца прыкладна ў 100 долараў — не абавязкова, але карысна) і ўласнага затрачанага часу атрымліваецца не так ужо і танна. Дый тканіна розная бывае. Самі разумееце, натуральны шоўк і сінтэтыка — рэчы непараўнальныя. Рабіць адзенне сваімі рукамі сталі, верагодна, таму, што захацелася якасці і эксклюзіву па прымальных коштах. Да таго ж, у адказ на пытанне «Адкуль паліто?» вельмі прыемна прызнацца, што пашыў яго сам.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Камандны дух

ГУЛЬНЯ РАШУЧЫХ І... СУМЛЕННЫХ

Сумняваюся, што знойдзецца шмат людзей, якія не чакаюць выхадных. Некалькі дзён, свабодных ад працы, заўсёды хочацца правесці выдатна адпачыўшы. Адным з такіх спосабаў баўлення часу з'яўляецца страйкбол — ваенна-тактычная камандная гульня, якая ўсё больш набывае папулярнасць. Яна перанясе вас у свет «баявых дзеянняў», дасць шанц займальна правесці выхадны дзень і падтрымаць у норме фігуру. Так лічыць і адзін з аматараў страйкбола Уладзіслаў Валахановіч. На мае пытанні пагадзіўся адказаць адзін з яе аматараў Уладзіслаў ВАЛАХАНОВІЧ.



— Раней я часта чуў пра гульню, але не меў дакладнага ўяўлення, што гэта такое. Мне стала цікава, і аднойчы я звярнуўся па дапамогу да інтэрнэту. Так даведаўся пра страйкбольныя клубы, пра цэны і, вядома ж, правілы гульні. І вось, прыкупіўшы рыштунак і амуніцыю, адправіўся ў першы «бой».

— І якія ўражанні ён пакінуў?

— Вядома, такое немагчыма забыць. Калі ты ўпершыню выходзіш на гульнявую пляцоўку, у цябе ў галаве круцяцца пытанні: «Дзе я? Што мне рабіць?» Ужо потым, калі асвоішся, з'яўляецца адрэналін, пачуцці, якія цяжка перадаць словамі!

— А што з сябе ўяўляе гульнявая пляцоўка?

— Найчасцей гэта закінутыя будынкі, лагеры або ўзгорыстая лясная мясцовасць. Галоўнае, каб яна не выкарыстоўвалася і амаль не наведвалася людзьмі. Удзельнікі загадзя агаворваюць сцэнарый, ставяць мэту і задачы: захоп будынкаў, знішчэнне «дыверсантаў» або «тэрарыстаў». Усё залежыць ад колькасці гульцоў і ад іх інтарэсаў. Ёсць, напрыклад, гульні, калі «баец» аказваецца адзін супраць усіх. У такія моманты абуджаюцца інстынкты, арганізм працуе на ўсю моц.

— Што, па-твойму, самае цікавае ў гульні?

— Тое, што на пляцоўцы ты бачыш свайго саперніка ў прыцэле «зброі», а праз паўгадзіны з ім жа каля вогнішча абмяркоўваеш гульнявыя моманты і смяешся з іх. Усё ж страйкбол — гульня сяброў. А нязручнасцю можа стаць надвор'е. Можна выпацкацца, замерзнуць ці прамокнуць... Але яно таго варта.

— Якія патрабаванні прад'яўляюцца да ўдзельнікаў?

— Гулец павінен быць старэйшы за 18 гадоў (але некаторыя арганізатары дазваляюць гуляць пры наяўнасці пісьмовага дазволу бацькоў і пры меншым узросце), мець абмундзіраванне, быць псіхічна здаровым... І сумленным.

— Няўжо сумленне адыгрывае такую важную ролю?

— Безумоўна. Бо страйкбол — гэта гульня, у якой няма ніякіх сігналаў аб тым, што вас «паранілі». Пры пападанні «кулі» — пластыкавага шарыка — вы часова выходзіце з гульні, надзеўшы чырвоную павязку. Але шарыкі зусім лёгкія (вагой ад 0,12 да 0,43 грама), здараецца, што ты не адчуваеш іх пападання. Для такіх выпадкаў на полі «бою» працуе суддзя, які сочыць за захаваннем правілаў і вырашае падобныя сітуацыі.

— Які мінімум амуніцыі трэба купіць навічкам?

— Найперш за ўсё камуфляж, ахоўныя акуляры і «зброю». Дарэчы, у страйкбольных клубах усё гэта можна ўзяць напракат. Асвоіцеся — тады купіце сваё.

...Што ж, засталося перасіліць сябе, забыцца ў выхадны пра любімую канапу і камп'ютар — і ў «бой». Спадзяюся, да хуткай сустрэчы на страйкбольнай пляцоўцы!

Анастасія КУЛІНЧЫК,
выпускніца 11 класа СШ №162
г. Мінска.

Экзотыка ў доме

СЯБРЫ МАЕ, ЛОРЫ І ШЫНШЫЛА

Мода — цікавая штука. Яна распаўсюджваецца не толькі на адзенне, упрыгажэнні, музыку. Сёння нармальнай з'явай лічыцца і мода на хатніх гадаванцаў. Нікога ўжо не здзівіш рэдкімі пародамі сабак, катоў, папугаяў ці рыбак. Звычайная справа завесці дома павукоў, змей, вожыкаў ці наогул кракадзілаў.

Але на ўтрыманне апошніх, як і іншых рэдкіх «суседзяў», трэба афармляць спецыяльны дазвол Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Пералік жывёл, якія падлягаюць афармленню, прыведзены ў СІТЭС (пералік відаў жывёл і раслін, што падпадаюць пад дзеянне Канвенцыі аб міжнародным гандлі відамі дзікай флоры і фаўны, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення). Яго можна знайсці на афіцыйным сайце міністэрства. Дазвол афармляецца таксама на віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу. Акрамя таго, патэнцыяльны ўладальнік падобных жывёл абавязаны прадставіць спецыяльнай камісіі доказ таго, што ён можа забяспечыць неабходныя ўмовы для іх камфортнага ўтрымання.

Пра незвычайных хатніх гадаванцаў і тое, як важна іх уладальнікам мець стасункі паміж сабой, расказвае **Андрэй САЎЧУК, стваральнік айчыннага некамерцыйнага сайта для аматараў экзатычных жывёл exoclub.by:**

— Я проста люблю жывёл і цікаўлюся імі з дзяцінства. У мяне дома жывуць лемуры, вавёркі, яноты, лоры, вожыкі, яшчаркі і павукі-птушкаеды. Набыць такіх жывёл даволі лёгка. У Мінску хапае заводчыкаў, якія спецыялізуюцца на кім заўгодна. «Аформіць» гадаванцаў таксама няцяжка. Для гэтага спатрэбяцца дакументы, якія вы атрымліваеце ад прадаўца. З імі трэба звярнуцца ў Мінпрыроды. Гэтым вы пацвярджаеце, што купілі жывёлу на законных падставах і што яна здаровая... Наш сайт ствараўся з мэтай аб'яднаць усіх, хто валодае цікавымі экзэмплярамі экзатычных выхаванцаў ці проста цікавіцца гэтай тэмай. На сайце ёсць форум, дзе ахвотныя могуць абмяркоўваць любыя тэмы, задаваць пытанні ці дзяліцца вопытам. Мы таксама імкнёмся публікаваць карысныя артыкулы. Калі з тых ці іншых прычын уладальнік экзатычнай жывёлы не можа знайсці адказ на сваё пытанне на форуме і сярод артыкулаў, ён можа адправіць запыт на электронны адрас сайта. Мы абавязкова дапаможам знайсці спецыяліста, які кампетэнтна ўсё растлумачыць. Такая практыка дазваляе значна спрасціць працэс догляду жывёл.

Фота Андрэя САЎЧУКА.

Што датычыцца ветэрынарнай дапамогі, то і гэта ўжо не праблема. Ёсць спецыялісты, якія ведаюць, як знайсці агульную мову менавіта з такімі гадаванцамі і як іх лячыць. З неахвотай бяруцца толькі за павукоў, бо з імі абыходзіцца асабліва складана. Хаця і хварэюць яны рэдка. Не ведаю, як у астатніх, а мае блізкія вельмі добра ставяцца да такога захаплення.

Дар'я АРЭФ'ЕВА,
студэнтка IV курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

SEX=БАЛЯСЫ

МАЎЧАЦЬ, ГАВОРАЦЬ, РОБЯЦЬ...

...Справа была зімой. Аднойчы вырашыў вынесці з кватэры смецце. Кажу жонцы, якая ў суседнім пакоі прасуе бялізну: маўляў, я да смеццеправода, туды і назад. Далей адчыняю дзверы ў тамбуры і літаральна лоб у лоб сутыкаюся з суседзямі. Мы вітаемся адно з адным і працісkаемся кожны ў патрэбным яму напрамку. Ад нечаканай сустрэчы я машынальна зачыняю за сабой дзверы. І ў тую ж секунду разумею, што ключ жа я з сабой не браў! А кнопкі кватэрных званкоў на лесвічную пляцоўку ў нашым доме амаль ні ў каго не выведзены... Нешта рабіць трэба тэрмінова, бо я апрануты зусім лёгка. Хуценька выкідваю смецце і з вядром еду ўніз, да ўваходных дзвярэй. Паколькі і ад іх ключа ў мяне з сабой няма, адчыніўшы дзверы знутры, высоўваюся па пояс, каб дацягнуцца да дамафона. Набіраю нумар кватэры. Ідуць гудкі, але ў адказ — цішыня...

Набіраю зноў, чакаю, думаючы пра тое, каб не апынуцца ўвогуле па-за пад'ездам. Нарэшце, чую незадаволены жончын голас: «Хто?» Кажу: «Свае, адчыняй тамбур...» Зайшоўшы ў кватэру, пытаюся ў яе, чаму не падыходзіла так доўга да дамафона. Яна ў адказ: «А я яшчэ думаю, чаму ты сам не падыходзіш да яго?» Пра маё папярэджанне, што іду выкідваць смецце, яна, зразумела, забылася — проста таму што была на сваёй хвалі, у сваіх думках. Мабыць, многія ведаюць, што гэта такое. («Жанчына, якая на ўсе твае пытанні адказвае фразай «усё нармальна», — гэта самая небяспечная з'ява ў свеце».) Дык гэта яшчэ ўсё па-добраму абышлося. Бо здараецца ж, як у тым анекдоце. «Сёння ранкам спакойна спытаўся ў жонкі: «Ты чайнік паставіла?» Пакуль моўчкі чысціў зубы, даведаўся, што яна ў мяне рабыня, я яе не цаню, перастаў бачыць у ёй жанчыну і нам увогуле пара разводзіцца, бо я знайшоў іншую... Нішто сабе гарбаткі папіў!»

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Калі ад думак жанчыны пераходзяць да спраў, таксама часам не засумуеш. Вось нядаўна, каб падтрымаць зборную Венесуэлы на Кубку Амерыкі па футболе, вядучыя тэлеканала «Голыя навіны» рэгулярна... распраналіся ў жывым эфіры (у прынцыпе, а чаго яшчэ чакаць ад работнікаў канала з такой назвай? А адна з іх падчас турніру забаўлялася тым, што рабіла прагнозы на матчы з дапамогай сваіх грудзей. Яна прымацоўвала да аголенага бюста сцяжкі каманд, а пасля без дапамогі рук спрабавала іх скінуць (эх, група «Топлес» такі шанец упусціла на нядаўнім чэмпіянаце Еўропы па мастацкай гімнастыцы!). Згодна з яе прагнозамі, прайграе тая каманда, чый сцяжок зваліцца першым... Дарэчы, не так даўно бачыў у інтэрнэце фатаграфію: у расійскай краме ля касы стаіць імправізаваная скрыня для ахвяраванняў з надпісам: «На новыя ногі футбалістам». Такі жарт мог напісаць толькі мужчына, які разумее, што адным толькі выглядам аголеных бюстаў вынікаў не дасягнуць, прынамсі ў футболе.

Зноў жа — пра іх думкі. «Хачу гарбаты!» — сказала дама і чамусьці адчыніла халадзільнік. Так-так, гэта ўсё пра жаночую логіку: чаго б такога паесці, каб пахудзець? Ну, з гэтым яшчэ мірыцца можна. А бывае ж і так. «Нікуды я з табой не пайду!!!» — «А чаго ты тады так прыбралася?» — «А каб ты бачыў, якая прыгажуня з табой нікуды не пайшла!» Яшчэ горш, калі ў іх з'яўляюцца такія думкі. «Пасварылася з сужэнцам, адвярнулася, ляжу і думаю: «Абдымі, ну, абдымі, блін!» І тут ён абдымае мяне, а я: «Так, рукі прымі!»

Але самая «песня» — гэта калі прадстаўніцы прыгожага полу кантактуюць паміж сабой. Адна сяброўка тэлефануе другой: маўляў, чым займаешся. «На веласіпедзе катаюся», — адказвае першая. «Каб пахудзець?» — «Не, навошта?» — «Ну, каб лішнюю дзірачку ў рэмені зрабіць»...

Паглядзіце, як гавораць пра строі ўдзельніц якога-небудзь конкурсу стылісты-жанчыны. «Спадніца прыгожа падкрэслівае тонкую талію і стройныя ногі дзяўчыны! Але кашуля з кветкавым прынтам з ёй абсалютна не спалучаецца. Лепш замяніць яе аднатоннай блузкай ці кароткім топам. А цёмныя калготкі — цялеснымі». У мужчынскіх мазгах адразу пачынае пульсаваць фраза з вядомага кінафільма: «Не зразумеў! Перакладзі!» Як быццам бы стыліст зрабіла камплімент, але фактычна прагучала зусім супрацьлеглае... «Сіняя сукенка і белы жакет не спалучаюцца з фіялетавымі туфлямі. У гэтым выпадку нават чорны абутак глядзеўся б лепш. Але ўвогуле вобраз неблагі, а галоўнае — універсальны!» Як кажуць, не жаночая гэта справа — маўчаць...

Наогул, сітуацыю добра перадае такі анекдот. «Жанчына — як кошка. Намякае вам, што сыходзіць. Адчыняеш ёй дзверы — не ідзе. Закрываеш — хоча сысці. Адчыняеш — не ідзе». Насамрэч, ёсць адзін спосаб зразумець жанчыну. Толькі яго ніхто не ведае...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«МОЙ САКРЭТ — У НАТУРАЛЬНАСЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Аднойчы вы сказалі, што жанчыны павінны любіць сябе, як робяць гэта мужчыны...

— Я заўсёды здзіўлялася і абуралася, назіраючы ў тым жа грамадскім транспарце сітуацыю, калі жанчыны сваіх дзяцей, мужа садзяць на вольныя месцы, а самі стаяць. У такія моманты сціраецца ўсялякае выхаванне, павага да старэйшых, да жанчыны ў прыватнасці. Таму хацелася б, каб жанчына любіла і цаніла сябе, як павінна. Тады і яе будуць любіць, адчыняць дзверы, падаваць руку... Вы пачынаеце паводзіць сябе як лэдзі — і ваш мужчына міжвольна стане праяўляць галантнасць.

— Вы лёгка пускаеце людзей у сваё жыццё?

— Пускаць пускаю, але цяпер паводжу сябе больш асцярожна з імі, бо за гады шмат адмоўнага вопыту назапасілася. Не адкрываю староннім душы. Я цаню ў людзях адкрытасць, прыстойнасць і шчырасць. І люблю чуць пра сябе, няхай і горкую, але праўду.

— Вы рознабакова сябе рэалізоўваеце: гастралюеце з канцэртамі, кіруеце агенцтвам па арганізацыі свят — і робіце ўсё паспяхова... Сакрэт ва ўменні планаваць і разлічваць свае крокі?

— Поспех — паняцце адноснае. У параўнанні, скажам, з Мадоннай і яе папулярнасцю, я наўрад ці нечага дасягнула. А вось у нашай краіне я куды больш паспяховая, чым яна. Лічу, што сакрэт у маёй натуральнасці. Я ніколі не іграла чужую ролю, не раздувала ўласную значнасць, не гналася за нейкай мішурой ці яшчэ нечым. Мабыць, мая шчырасць і адкрытасць і з'яўляюцца асновай таго, што да мяне не губляецца інтарэс. А вось наконт планавання, то, калі б умела рабіць гэта дасканала, змагла б дасягнуць большых вяршынь. Асабліва ў фінансавым плане. Я ж, наадварот, кіруюся эмоцыямі. Мяне ў першую чаргу хвалюе, ці добра іншым.

«Я ганаруся сваёй сям'ёй, дзецьмі. Адчування, быццам рэалізавала сябе на сто працэнтаў, няма. Спадзяюся, усё яшчэ наперадзе і мне ёсць да чаго імкнуцца».

— Пры ўсёй занятасці, сям'я ў вас на першым месцы?

— Так, родныя і блізкія для мяне заўсёды ў прыярытэце. Таксама і з сябрамі, калі некаму патрабуецца дапамога. Лічу, што гэта правільна.

— Чым абумоўлена жаданне шукаць сябе ў розных відах дзейнасці?

— Мне цікава займацца тым, што прыносіць мне задавальненне. І, безумоўна, у свой час была ўзнята высокая планка. А ўвогуле, раблю тое, да чаго ляжыць душа.

— Што сёння патрэбна беларускай публіцы?

— На гэтае пытанне цяжка адказаць. У нас на тэлебачанні сёння не так шмат забаўляльных праектаў, таму і артысты, напрыклад, не бачаць сэнсу ў выпуску кліпаў. Дзе ўсё гэта паказваць? І застаецца вечнае пытанне: што за людзі на сцэне? Такі наш менталітэт. Пакуль не з'явіцца гонар за сваю краіну і за сваіх людзей, ад гэтага не пазбавіцца. Публіка патрабуе, каб пра яе клапаціліся. Ёй хочацца ведаць, што менавіта яна найлепшая!

— У вас было шмат тэлевізійных праектаў і нават перспектыва з'ехаць у Маскву...

— Мне часта нагадваюць пра гэта, але я не магу даць дакладнага адказу, таму што не пражыла тое жыццё, якое мела б там. Веру, лёс заўсёды прыводзіць нас туды, дзе нам наканавана быць. Магчыма, калі б у Маскве мне прапанавалі пэўную стабільнасць у плане працы і жылля, тады магла думаць. Але людзі, якімі я даражыла ў Беларусі, аказаліся для мяне важнейшымі, чым кар'ерны рост.

«Ніколі не іграла чужую ролю, не раздувала ўласную значнасць, не гналася за нейкай мішурой ці яшчэ нечым. Мабыць, мая шчырасць і адкрытасць і з'яўляюцца асновай таго, што да мяне не губляецца інтарэс».

— Азіраючыся на пройдзены шлях, вы маеце чым ганарыцца?

— Я ганаруся сваёй сям'ёй, дзецьмі. Адчування, быццам рэалізавала сябе на сто працэнтаў, няма. Спадзяюся, усё яшчэ наперадзе і мне ёсць да чаго імкнуцца.

Алена ДРАПКО.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.183.
Нумар падпісаны ў 19.30 08.07.2015 г.

■ Незвычайнае побач

ЦУДАТВОРНЫ АБРАЗ НА САСНЕ

У XVII стагоддзі ён вярнуў зрок невідушчаму

Усе мы ведаем, што Жыровіцкі манастыр славіцца цудадзейным абразом Божай Маці «Жыровіцкі». А не так даўно стала вядома, што і ў суседнім, Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці, таксама калісьці быў цудатворны абраз Божай Маці, які з'явіўся тут сляпому на хвоі паблізу вёскі Боркі.

На месцы з'яўлення іконы ў 1670 годзе была ўзведзена царква, якая за сваю гісторыю некалькі разоў наноў будавалася на тым жа месцы, але да нашых дзён не захавалася. Мясцовая назва месца з'яўлення цудатворнага абраза — Гай. 12 кастрычніка 1973 года царква была спалена, але людзі навакольных вёсак з тых часоў наведваюць тое месца: паставілі крыж, лаўкі, альтанку. У які менавіта час быў страчаны цудатворны абраз, засталося таямніцай. Да нядаўняга часу нават протаіерэй Тарасій Віцько, настаяцель любішчыцкага храма ў гонар Святой праведнай Ганны (Івацэвіцкі раён), які, падтрымліваючы традыцыю, некалькі разоў на год служыў акафісты на прыблізным месцы спаленай царквы, не ведаў, што гэтае месца настолькі праслаўленае.

— Усё пачалося з тэлефоннага званка з экзархата, — распавядае айцец Тарасій, да прыходу якога цяпер адносіцца і в. Боркі. — На тым канцы проваду прагучала пытанне: «Чаму вы не аднаўляеце сваю святыню — цудатворны абраз Борацкай Божай Маці?» Я быў, шчыра сказаць, ашаломлены пачутым. Бо нічога пра такую ікону ніколі ў Івацэвіцкім благачынні ніхто не чуў і не здагадваўся. І сталі мы шукаць, перакапалі горы літаратуры царкоўнай, праваслаўныя сайты і, дзякуй Богу, сёе-тое знайшлі.

Айцец Тарасій працягнуў мне адзнятыя старонкі царкоўнага летапісу з кнігі айца Міхаіла (Ермакова), мітрапаліта Кіеўскага, экзарха Украіны, а з 1905-га па 1915-ы — архіепіскапа Гродзенскага і Брэсцкага. У раздзеле «Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы», напісана: «У с. Борках, Слонімскаго павета, Быценскаго благачынння, у сасновым бары царква драўляная, з такой жа званіцай, у драўлянай агароджы, збудаваная ў 1778 годзе на месцы ранейшай царквы. У ёй маецца цудатворная ікона Багародзіцы з Прадвечным Богадзіцяткам на левай руцэ Борацкая, — вялікая, напісаная на палатне алейнымі фарбамі, у срэбнай рызе, месцамі пазалочанай.

«Сапраўды заслона спала з вачэй, калі я выйшаў з царквы...»

Як паведамляе царкоўны летапіс, царква ўстроена на месцы з'яўлення гэтай святой іконы, і яно тут перадаецца так: «У XVII стагоддзі быў тут густы лес і ручай, праз які ляжала кладка: па кладцы раз прабіраўся сляпы з павадыром і ўпаў. Невядомы голас пры гэтым паклікаў яго: «Паглядзі ўгору!», і калі той падняў твар, ясна ўбачыў на вялікай сасне, што стаяла побач, зіхценне святога абраза Багародзіцы: той, хто быў сляпы, стаў з гэтага часу зусім відушчым». Месца гэтае неўзабаве адзначылі збудаваннем царквы, і яна тут з 1670 г. Царква была першапачаткова прыпісной да суседняй, Любішчыцкай, збудаванай князямі Сапегамі, а з 1698 года стала самастойнай, прыходскай. Дрэва, на якім паказалася св. ікона, у значнай яго частцы стаіць дагэтуль на сваім месцы — яно ў алтары паміж велізарным Багародзічным кіётам і алтарнай задняй сцяною храма: амаль у рост чалавека вышынёю, у ніжняй частцы вельмі тоўстае. Верхавіна ж яго разабраная багамольцамі, якія з даўніх часоў у мноства прыходзяць сюды, поўныя глыбокага спадзявання на дапамогу, асабліва пры вочных хваробах. Паколькі пастаянна збіралася сюды мноства людзей, то князі Сапегі, яшчэ ў 1698 годзе, адлучылі да царквы пад прытулак пры ёй багамольцаў 10 моргаў зямлі, з хваёвымі рослымі дрэвамі па ёй, дзе і цяпер маецца прывольны гаявы прытулак, — не заняты нікім і нічым...»

Барэцкая ікона Божай Маці ў руках дыякана Сцяфана і айца Сымона — сына і бацькі протаіерэя Тарасія, настаяцеля Любішчыцкага храма.

Акафіст Божай Маці служыў уладыка Сцяфан.

А вось яшчэ адно апісанне цуду ацалення сляпога: «...У 1860 гадах бягучага стагоддзя перад гэтым святым абразом, пасля стараннай малітвы, пачаў бачыць селянін бліжэйшай да Боркі вёскі Падстарынь Стэфан Крот: «Сапраўды заслона спала з вачэй, калі я выйшаў з царквы пасля руплівага багамолля прад святой іконай Багародзіцы», — казаў ён усім, як гэта значыцца ў царкоўным летапісе».

Айцец Тарасій паведаміў Высокапраасвяшчэннейшаму архіепіскапу Пінскаму і Лунінецкаму Сцяфану пра гэтую незвычайную гісторыю, а неўзабаве было прынята рашэнне зрабіць спіс цудатворнага абраза. Нядаўна на месцы з'яўлення Борацкай іконы адбылася гістарычная падзея для нашага Івацэвіцкага раёна — спіс цудатворнага абраза Божай Маці быў прывезены сюды ўладыкам Сцяфанам. Прыхаджанам, якія прыехалі з навакольных вёсак і райцэнтра, у пропаведзях архіепіскапа і айца Тарасія было расказана пра гісторыю храма і цудатворнага абраза. Акафіст Божай Маці, велічанні ёй і Мікалаю Цудатворцу спяваліся на фоне прыроды з вялікім натхненнем. Дарэчы, у той дзень ішоў дождж, але прыхаджане то тут, то там выказвалі несумненную ўпэўненасць, што Божая Маці ўсё наладзіць. І ўявіце: падчас набажэнства заззяла сонца! Вось што значыць аддацца волі Божай.

Надзею на тое, што благадаць вернецца, нягледзячы на нашы грахі — страту іконы і храма, выказаў айцец Тарасій. Такая ж надзея гарыць у сэрцах вернікаў — праз 345 гадоў цудатворны абраз нагадаў пра сябе, а значыць, гэта адпавядае волі Божай. Да таго ж, адкрыю вам адзін маленькі сакрэт, у гэты ж дзень невядомымі шляхамі ў нашым раёне апынуўся хлопчык, якому неўзабаве трэба будзе рабіць аперацыю на вочы. Яго прыклалі да абраза і, скажу шчыра, сэрца замірае ў надзеі на цудоўнае ацаленне. Хоць сам факт, што ён апынуўся тут, у полі, у момант прыбыцця іконы, ужо цуд, сэнс якога калісьці, калі будзе патрэбна Госпаду, будзе раскрыты.

Спіс цудатворнага абраза (дарэчы, Казанская ікона Божай Маці таксама спіс, але яна, тым не менш, цудатворная) будзе захоўвацца ў Свята-Ганнінскім храме в. Любішчыцы, а кожную пятніцу ўвечары каля яго будзе служыцца акафіст Божай Маці Борацкай. Тры разы на год — 22 мая, 21 ліпеня і 21 верасня — акафісты будуць служыцца на месцы з'яўлення цудатворнай іконы — у Гаі.

Валянціна БОБРЫК.
Фота аўтара.

г. Івацэвічы

■ Не прапусціце!

АДНАКЛАСНІК ШАГАЛА ЗАВІТАЎ У ВІЦЕБСК



Упершыню ў Беларусі прадстаўлена персанальная выстава твораў Восіпа Цадкіна, вядомага на ўвесь свет мастака і скульптара. Цікава, што ён быў аднакласнікам Марка Шагала. Цудам у Віцебску захаваўся будынак, дзе яны вучыліся. Падчас адкрыцця выставы не раз падкрэслівалі, што яе можна лічыць сенсацыйнай культурнай падзеяй сусветнага маштабу. Бо яшчэ не было персанальных выстаў твораў генія.

— Мы ганарымся тым, што персанальная выстава твораў Цадкіна адкрылася ў яго родным горадзе. Тут можна ўбачыць творы з карпаратыўнай калекцыі Белгазпрамбанка, а таксама з прыватных калекцый. А музей на ёй прадставіў паштоўку, якую Цадкін у 1916 годзе даслаў свайму настаўніку Юрыю Пэну, калі ён служыў у французскай арміі, — распавяла **дырэктар Віцебскага мастацкага музея Вольга АКУНЕВІЧ**.

Мастацтвазнаўцы, дарэчы, доўгі час спрачаліся наконт таго, дзе ж нарадзіўся Цадкін. У сваёй кнізе ён узгадваў, што на Смаленшчыне.

— Калі ў 1990-я гады ў Віцебску пачыналі «вяртаць Шагала», было нешта падобнае, як і з Цадкіным. Я пра белыя плямы ў біяграфіі. У прыватнасці незразумелая па дакументах дата нараджэння, «мутнае паходжанне», — разважае **мастацтвазнаўца, краязнаўца, былы дырэктар Музея Шагала Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ**.

У дарэвалюцыйны час многія яўрэі спрабавалі ўтойваць сапраўдныя звесткі пра сваіх бацькоў, месца нараджэння. Напрыклад: як пісаў Цадкін, яго бацька быў ахрышчаным яўрэем і прафесарам класічных моў у Смаленскай семінарыі. А ў спісе выкладчыкаў гэтай установы няма адпаведнага запісу. У інтэрнэце можна прачытаць пра тое, што Цадкін нарадзіўся ў Смаленску. Дзіўна, але ў савецкі час у гэтым засумняваўся адзін з самых паважаных смаленскіх краязнаўцаў...

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Скульптура Цадкіна.

А вось наконт таго, што Цадкін вучыўся з Шагалам, няма сумненняў. Ёсць дакументы, якія пацвярджаюць, што Восіп у пачатку 1900-х гадоў атрымліваў адукацыю ў Віцебскім гарадскім вучылішчы з Шагалам і будучым мастаком Віктарам Меклерам.

Такі цудоўны падарунак Віцебску — выставу і не толькі яе — зрабілі кіраўнікі Белгазпрамбанка.

— Так, мы гатовы спрыяць і ў даследчай рабоце: больш падрабязнаму вывучэнню біяграфіі мастака... — распавядае карэспандэнту «Звязды» **старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар БАБАРЫКА**. — Заўсёды адкрыты і для ажыццяўлення іншых праектаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

Запоіны. Заручыны. Калі падчас сватаўства бацька і дачка давалі прысутным згоду на вяселле, пачыналіся так званыя «запоіны» («запівіны», «малыя заручыны», «малая гарэлка»). Пасля «запоін» дзяўчына лічылася засватанай. На Беларусі пра яе казалі: «яна запіта» ці «заедзена яечняй».

◈ Але пасля гэтага абраду вяселле яшчэ не было абавязковым. Калі па якой-небудзь прычыне адзін ці другі бок не выконвалі патрабаванняў, даведваліся што-небудзь дрэннае пра жаніха ці нявесту, калі не падабаўся пасаг ці штосьці яшчэ, дамоўленасць магла быць скасавана.

◈ Звычайна праз тыдзень пасля запоін адбываліся заручыны. Асноўная мэта заручын («змовін», «вялікай гарэлкі», «вялікіх запоін», «ладу», «рукабіцця») была ў канчатковай дамоўленасці аб правядзенні вяселля, усіх яго абставінах — як эканамічных, так і абрадавых.

◈ На заручыны, якія адбываліся ў хаце нявесты, запрашалі больш шырокае кола сваякоў, якія былі сведкамі перамоў і дасягнутай дамоўленасці. Удзельнікі гэтага абраду павінны былі больш дэталёва пазнаёміцца з сем'ямі двух родаў; вызначыць асноўных удзельнікаў вяселля (шафер, шаферка і г.д.); вызначыць колькасць гасцей з кожнага боку; колькасць сваякоў, якіх неабходна ўшанаваць падарункамі на вяселлі; тых, хто будзе пячы вясельны каравай; пагадзіцца на склад і колькасць пасагу; тут жа вызначаўся дзень і час вянчання і г.д.

◈ З XVII—XVIII стст. абрад заручын заканчваўся тым, што жаніх і нявеста абменьваліся пярсцёнкамі і тым самым давалі згоду на шлюб. Пасля гэтага бацька нявесты звязваў рукі маладых са словамі: «Дай, Божа, у добры час, на вясёлае жыцце, на дзяцінае шчасце!».

